Кошт нумару 5 кап.

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Камітэту Саветаў БССР.

10 год выдання

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА.

№ 152 (2641) Субота, 6-га ліпеня 1929 г.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Навыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к. „ 3 „ — 2 р. 70 к. „ 6 „ — 4 р. — к. „ 1 год — 8 р. — к. Зьмена адрасу: іншагародняя — 20 к. мясцовая — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок пашпарэй пасьля тэксту — р. 50 к. За радок пашпарэй пасьперад тэксту 1 р. — к. За радок пашпарэй перад тэкстам 1 р. 50 к. Скідкі на 50 проц. дазволены. Зьмена тарыфу бароцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумант — 25 кап. За кожны дадатковы — 15 „ Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумант — 15 „ За кожны дадатковы — 5 „ Публікацыі ЗАГС'ту—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газеты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пашт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

154кр. "Савецкая Беларусь" ОДЕССА, Пастера, 13 Дзярж. Публічн. бібліят. студз. сьнежань адз. экз.

Міжнародны Дзень Кооперацыі і нашы задачы.

Сёньня працоўныя ўсіх краін сьвяткуюць Дзень Кооперацыі. Сёньня падводзяцца вынікі дасягненьняў кооперацыі, адзначаюцца недахваты і вызначаюцца шляхі яе далейшага разьвіцьця. Але па рознаму сьвяткуецца гэты дзень у нас, у СССР, і ў капіталістычных краінах. У нас, дзе ўлада знаходзіцца ў руках працоўных, кооперацыя зьяўляецца адным са сродкаў будаўніцтва сацыялізму; у буржуазных краінах, дзе большасьць кооператыўных аб'яднаньняў знаходзіцца ў руках сацыял-здраднікаў, кооперацыйныя правадыры вядуць жорсткую барацьбу супроць рэвалюцыйна-пралетарскага руху ў кооперацыі; у нас кооперацыя будзіць самадзейнасьць працоўных мас і дапамагае выкарчоўваць апошнія астаткі капіталістычнай сыстэмы; у капіталістычных краінах згоднікі садзейнічаюць усё большаму і большаму аб'яднаньню спажывецкай кооперацыі з капіталістычнымі прадпрыёмствамі.

Ня гледзячы на зрадніцкую палітыку сацыял-згодніку, растуць рэвалюцыйныя сілы рабочае клясы ў буржуазных краінах. У дзень сьвята кооперацыі яны прыложаць усе сілы, каб растлумачыць сутнасьць дробнабуржуазнай палітыкі правадыроў кооперацыі, заваяваць яе і ўключыць у агульны рэвалюцыйны фронт барацьбы за вызваленьне рабочае клясы, за захоп ёю палітычнай улады.

Пад якімі лёзунгамі мы сьвяткуем Міжнародны Дзень Кооперацыі? Наша кооперацыя зьяўляецца часткаю вялізарнейшай працы рабочае клясы і працоўнага сялянства па сацыялістычнай перабудове нашай гаспадаркі. Праца савецкай кооперацыі па сваіх мэтах цалкам і поўнасьцю саўпадае з агульнымі задачамі і працай сацыялістычнай дзяржавы. Вось чаму наша кооперацыя павінна служыць клясавым інтарэсам працоўных мас, вось чаму рабоча-сялянскія масы, правяраючы дасягненьні кооперацыі, павінны згуртаваць сваю ўвагу на чарговых задачах сацыялістычнага будаўніцтва.

Кооперацыя не стаіць і на можа стаяць у баку ад клясавай барацьбы; наадварот, кооперацыя ў нас зьяўляецца адным з самых моцных сродкаў барацьбы з капіталістычнымі элемэнтамі ў горадзе і ў вёсцы. З гэтага пункту погляду працоўныя масы нашай краіны будуць ацэньваць працу кооперацыі.

Мы ў сучасны рэканструкцыйны пэрыяд перажываем некаторыя цяжкасьці; кооперацыя асабліва адчувае ў сваёй працы гэтыя цяжкасьці, якія выплываюць з нашых гаспадарчых абставін. У дзень сьвята кооперацыі працоўныя масы асабліва павінны ўявіць прычыны гэтых цяжкасьцяў і чарговыя задачы далейшага кооперацыйнага будаўніцтва.

Мы ведаем, што наша кооперацыя з кожным годам узмацняецца: растуць яе капіталы; пашыраецца нізавая сетка; усё большая і большая колькасьць насельніцтва кооперуецца; паляпшаецца абслугоўваньне спажыўца і самае галоўнае тое, што кооперацыя становіцца на шлях **масавага вытворчага кооперараваньня і калектывізацыі вёскі.** Гэтыя дасягненьні нашай кооперацыі відавочны. Але адначасова з гэтым кооперацыя мае і шэраг хібаў. Вялізарнейшая роля кооперацыі ў справе сацыялістычнай перебудовы вёскі яшчэ не ў дастатковай ступені ўсьвядомлена працоўным сялянствам, яшчэ слаба ўцягнуты сродкі самога сялянскага насельніцтва ў кооперацыйнае будаўніцтва. Задача ўсяе кооперацыі, усёй савецкай грамадзкасьці—згуртаваць увагу на працэсах вытворчага кооперараваньня і калектывізацыі на кіраўніцтве вытворчымі аб'яднаньнямі і збыце сялянскай прадукцыі, на забясьпечаньні кооператыўных аб'яднаньняў сродкамі вытворчасьці і на мабілізацыі для кооперараваньня сродкаў самога насельніцтва.

Барацьба за якасьць працы ў нашай кооперацыі заўсёды зьяўлялася важнейшым лёзунгам пры правядзеньні ім Міжнароднаго дню кооперацыі. Трэба адзначыць, што не ва ўсіх зьвеньнях кооперацыі мы маем добрую якасьць працы. Вось чаму неабходна, поруч з праверкаю і падвядзеньнем вынікаў палітычных, праверыць і падвесьці вынікі гаспадарчай дзейнасьці кооперацыі, што адно ад другога ні ў якім разе нельга адлучыць і вызначыць шляхі далейшага палепшаньня працы.

У сучасны момант, пры наяўнасьці абвостранай клясавай барацьбы, нэпманска-кулацкі элемэнт старацца пралезьці ў кооперацыйны апарат і скарыстаць слабыя яго зьвеньні ў сваіх інтарэсах. Трэба ўзяць рашучы напрамак на шырокае кооперараваньне беднаты, трэба паклапаціцца, каб кооперацыйны апарат адпавядаў тым задачам, якія стаяць перад намі на шляху сацыялістычнага будаўніцтва; трэба ўцягнуць кооперацыю ў сацыялістычнае спаборніцтва, паставіўшы задачы —за лепшую якасьць працы, за лепшае прадпрыёмства.

У дзень Міжнароднага Сьвята Кооперацыі перад нашай кооперацыяй стаіць яшчэ адна надзвычайна важная задача—яшчэ больш шчыльнай сувязі з масамі, уцягненьня саміх мас у кооперацыйнае будаўніцтва, утварэньня шырокага кооперацыйнага актыву.

На працэсе фабрыкантаў фальшывак.

ВЫЯЎЛЯЕЦЦА БОЛЬШАЯ КОЛЬКАСЬЦЬ „ДАКУМАНТАЎ" І СУВЯЗЬ АРЛОВА З НЯМЕЦКАЙ ПАЛІЦЫЯЙ.

БЭРЛІН, 5-7. На ўчарайшым пасяджэньні суду па справе Арлова і Паўлаўскага абаронца Паўлаўскага прасіў суд задаць сьведкам Брашвіцу і Гелеру (паліцэйскія камісары) такія запытаньні: ці сапраўды Паўлаўскі на працягу некалькіх гадоў дастаўляў паліцыі каштоўныя дакументы, за якія атрымліваў значныя сумы; ці не пакінуў Паўлаўскі дабраахвотна савецкае службы.

Абаронца Арлова пратэставаў проці гэтых пытаньняў, заяўляючы, што ён ня хоча даваць паліцэйскім камісарам магчымасьці абдумваць свае адказы на працягу сутак. Ён прасіў суд перапыніць працэс да таго часу, пакуль прускае міністэрства ўнутраных спраў ня дасьць адказу на яго скаргу аб паводзінах паліцэй-прэзыдэнта. (Паліцэй-прэзыдыум забараніў сваім камісарам даваць паказаньні на судзе; кожнае запытаньне павінна быць пададзена загадзя на зацьверджаньне паліцэй прэзыдыуму).

Аднак, сам абаронца задаў Брашвіцу запытаньне, чаму палітычная паліцыя ўжо больш не дапытвала Арлова, „а яна карысталася яго дапамогаю, як экспэрта". Брашвіц заявіў на гэтае запытаньне, што дапытваў Арлова ў астрозе, але як абвінавачанага, бо Арлоў западозран ва ўдзеле ў падлозе дакументу, накіравага проці нямецкай дзяржавы.

Далей суд заслухаў паказаньні некалькіх сьведак, якія разаслалі асобныя «дакументу» «работы» фабрыкі фальшывак. Гэтыя „работы" датычаць выпуску фальшывых бляшкаў, падложных пячацяў і г. д. У зьвязку з дочытам гэтых сьведак было зачытана 8 фальшывых „лістоў ДПУ", перададзеных Паўлаўскім Зівэрту (агульны ліст гэтых фальшывак дасягае больш 20-ці). Арлоў заяваў, нібыта ён атрымліваў гэтыя «лісты» ад тайнага агента ДПУ Крошкі.

ФРАНЦУСКІ ЎРАД І ДАЎГІ.

СУПЯРЭЧНАСЬЦІ ПАМІЖ УРАДАМ І ПАРЛЯМАНТАМ.

ПАРЫЖ, 4-VII. У цэнтры ўвагі парляманцкіх колаў—пытаньне аб форме ратыфікацыі даўгавых згод. Апазіцыйныя групы імкнуцца да таго, каб у якасьці кампэнсацыі ратыфікаваць даўгавыя згоды і дамагчыся зьмен у складзе ўраду. Урадавыя-ж фракцыі імкнуцца стварыць як мага больш шырокую „ратыфікацыйную большасьць" длятаго, каб узьнікала неабходнасьць рэарганізацыі ўраду. У выніку барацьба адбываецца навакол фармулёўкі агаворак, якая не падыйшла-б для правых груп.

Сацыялісты і радыкалы спадзяюцца, што ў гэтым разе будзе створана новая левая большасьць, за ратыфікацыю, а гэта зробіць няўхільным рэарганізацыю ўраду ўлева. Урад-жа, як паведамляе „Матэн", схіляецца да такой схэмы: палата дэпутатаў, даручаючы ўраду ратыфікаваць даўгавыя згоды ў парадку дэкрэту ці праз галасаваньне закону па ратыфікацыі бязніякіх агаворак, прымае рэзалюцыю, у якой пералічвае ўсе пажаданыя агаворкі да ратыфікацыі. Гэты парадак, які адлучае галасаваньне ратыфікацыі ад галасаваньня спрэчных агаворак, палягчае як правядзеньне ратыфікацыі, так і прыняцьце агаворак, на якія згодзіцца ўрад. Гэты парадак сустракае спачуваньне большасьці ўмерана-правых урадавых груп, але пакуль што натыкаецца на супраціўленьне левае часткі апазіцыі, якая дамагаецца ўключэньня агаворак у самы тэкст закону аб ратыфікацыі.

НАРАДА МІНІСТРАЎ.

ПАРЫЖ, 5-7. Агенцтва Гаваса паведамляе: «Рада міністраў скончыла разгляд становішча, створанага ў зьвязку з пастановамі фінансавае кэйсі па пытаньні аб ратыфікацыі даўгавых згод».

Абраньне т. Марты правамоцна.

ПАРЫЖ, 3-7. Парляманцкая камісія, назначаная для праверкі абраньня Марты, прызнала выбары правамоцнымі. У блізкай будучыні павінна зацьверджаць абраньне Марты. Камфракцыя намерана ў спрэчках па гэтым пытаньні затрабаваць неадкладнага выказаньня Марты і ўзьняць пытаньне аб усіх ваенна-палітычных зьнявольных.

* * *

ПАРЫЖ, 5-7. Агенцтва Гаваса паведамляе: „Палата дэпутатаў зацьверадзіла выбары т. Марты дэпутатам.

УРАД МАКДАНАЛЬДА—НА ШЛЯХУ ЦЬВЁРДАЛОБЫХ.

МАКДАНАЛЬД ПАДЗЯЛІЎ РОЛІ.

ЛЁНДАН. 4-УП. Агенцтва Рэйтэра паведамляе: «Адказваючы ў палаце вобшчын на запытаньне, міністр замежных спраў Гендэрсон паведаміў, што ён будзе ўдзельнічаць у верасьнёўскай сэсіі Лігі Нацый. Макдональд таксама будзе ўдзельнічаць у сэсіі, але ня ўвесь час. Далей Гендэрсон паведаміў, што ў склад ангельскае дэлегацыі ўвойдзе лёрд Сэсіль, які згодзен таксама быць ангельскім прадстаўніком у падрыхтоўчай камісіі да канфэрэнцыі аб разброеньні.

Лёрд Сэсіль быў раней прадстаўніком у Лізе Нацый пры ўрадзе Бальдвіна (да 1927 году), але адмовіўся ад сваіх абавязкаў, пераважна, з прычыны таго, што быў прыхільнікам больш рашучае палітыкі ў пытаньнях разброеньня».

„ПАПРАЎКА" ЦЬВЁРДАЛОБЫХ.

ЛЁНДАН, 5-УП. Кансэрватары Аліваэр, Лёкер Лемпсон (лідэр цьвёрдалобых) і Сэсіль Хэнбэры паведамілі, што яны падаюць папраўку да троннае прамовы. У папраўцы выказваецца жаль, што ў троннай прамове памінаецца аднаўленьне зносін з СССР без таго, каб савецкі ўрад узяў на сябе абавязацельства запланіць даўгі і ўстрымацца ад умешваньня ў ангельскія справы

Цьвёрдалобыя хваляць урад Макдональда.

ЛЁНДАН, 5-7. Агенцтва Рэйтэра паведамляе: „У палаце вобшчын пры абмеркаваньні пытаньняў мясцовае палітыкі выступіў Чэмбэрлен. Закрануўшы пытаньне аб эвакуацыі Рэйнскае вобласьці, Чэмбэрлен заявіў, што эвакуацыя ангелькага войска нічога ня дасьць, калі Францыя і Бэльгія ня зробяць таго-ж самага. Спыніўшыся далей на пытаньні аб адносінах з СССР, Чэмбэрлен выказаў здаволеньне тым, што ўрад радзіцца з урадамі дамініёнаў.

Выступіўшы з адказам міністр унутраных спраў Гендэрсон заявіў, што Англія будзе спрабаваць, каб францускі і бэльгійскі ўрады ажыцьцявілі эвакуацыю Рэйнскае вобласьці разам з Англіяй

Рост уплыву камуністаў і нянавісьці да Англіі.

ЛЁНДАН. Наконт Міруцкага працэсу ў Індыі орган незалежнае рабочае партыі «Нью-Лідэр» піша: „Няспрыяючая атмасфэра, створаная арыштам дзенчоў індыйскіх прафсаюзаў у ліку 31 асобы, яшчэ паглыбілася спосабам вядзеньня працэсу. Абвінавайца, які дзейнічае па даручэньні ўраду, мае нейкую дзівацкую манеру гаварыць. Не зважаючы на тое, што афіцыйна вядома аб намеры ангельскага ўраду аднавіць прыяцельскія дачыненьні з Расеяй, пракурор, як паведамляе друк, заявіў, што „кожны сябра расейскага ўраду працуе над нізрынуцьцем ураду яго вялікасьці ўсімі сродкамі".

Судовае дазнаньне ня было часова спынена ў зьвязку з хадайніцтвам абароны аб перадачы справы ў суд прысяжных. Той факт, што абвінавачаным не даецца нават іх законнага права, выклікаў усеагульнае абурэньне. Дзякуючы паводзінам пракуратуры толькі пашырылася папулярнасьць камуністаў і павялічылася нянавісьць да ангельскае адміністрацыі".

Чыгуначнікі патрабуюць павышэньня зарплаты.

ЛЁНДАН, 5-7. Канфэрэнцыя нацыянальнага саюзу чыгуначнікаў, якая адбываецца ў Саутгэмптоне, ухваліла даць чыгуначным кампаніям 3-хмесячны тэрмін для ліквідацыі леташняе згоды з рабочымі, згодна якое заработак чыгуначнікаў быў зьніжаны на 2 з паловаю працанты,

Англія „дапаможа" пабудаваць флёт.

ЛЁНДАН, 2-7. Ангельскае міністэрства замежных спраў паведамляе аб падпісаньні згоды між Англіяй і Кітаем наконт абучэньня кітайскіх юнкераў у Англіі і наконт дапамогі з боку ангельскае вайсковае марское місіі ў пашырэньні кітайскага марскога флёту.

РЭФАРМІСТЫ ЯШЧЭ СПАДЗЯЮЦЦА

ЛЁНДАН, 3-7. Канфэрэнцыя агульнаангельскага саюзу чыгуначнікаў ухваліла рэзалюцыю, якая выказвае надзею на тое, што ўрад «знайдзе магчымым скасаваць ганебную пастанову закону аб прафсаюзах» (выдадзенага ў 1927 годзе).

Папраўка да рэзалюцыі з патрабаваньнем скасаваць увесь закон цалкам была адхілена пераважаючаю большасьцю галасоў.

У КІТАІ.

Усё яшчэ „зьбіраюцца" ў дарогу.

ПЭЙПІН, 4-VII. Ен-Сі-Шан усё яшчэ знаходзіцца ў шпіталі. Што датычыць Фынь-Юй-Сяна, дык наконт яго намераў распаўсюджваюцца самыя супярэчныя чуткі. „Пэйпін-Іны-Бао" паведамляе, што Фынь-Юй-Сян-згадзіўся адкласьці свае падарожжа заграніцу, паколькі Ен-Сі-Шан, які гарантаваў яму безапаснасьць, сам ня вольны ў сваіх учынках.

Агенцтва Говэн паведамляе, што Фынь-Юй-Сян заявіў, што ён ня хоча кідаць краіны да таго часу, пакуль урад ня выпрацуе тэрміновых плянаў наконт паўночна-заходніх правінцый і наконт дапамогі яго войску. Як паведамляе друк, Ен-Сі-Шан паведаміў Фынь-Юй-Сяна, што з прычыны рашэньня Чан-Кай-Шы падацца ў адстаўку ў выпадку адстаўкі Ен-Сі-Шана, ён (Ен-Сі-Шан) часова застанецца ў Пэйпіне.

Голад у Ганьсу

ПЭЙПІН, 4-VII. Водлуг паведамленьня газэты «Хуабэй-Жы-Бао», у правінцыі Ганьсу кожны дзень памірае ад голаду 2 тысячы чалавек, Ёсьць шмат выпадкаў людаедзтва, калі бацькі зьядаюць сваіх дзяцей.

Польшча прывозіць зброю з заграніцы.

БЭРЛІН, 3-УП. «Дэйтшэ Тагесцэйтунг» паведамляе з Данцыгу, што між 27 і 30 чэрвеня праз польскі вайсковы порт каля Данцыгу правезены вайсковыя грузы, прызначаныя для польскага вайсковага камандаваньня. Грузы накіроўваліся як у Польшчу, так і з Польшчы і іх перасоўваньне абумоўлена жаданьнем польскага вайсковага камандаваньня замяніць на аднолькавае ўзброеньне розныя гатункі заграничных вінтовак.

НА КАНГРЭС ЛІГІ БАРАЦЬБЫ СУПРОЦЬ ІМПЭРЫЯЛІЗМУ.

БЭРЛІН, 3-7. На надыходзячым у Франкфурт-на Майне кангрэсе ангельскае лігі барацьбы проці імпэрыялізму будзе абмяркоўвацца таксама пытаньне аб задачах прафсаюзаў у зьвязку з барацьбою проці імпэрыялізму. Некаторыя прафсаюзы заявілі ўжо аб сваім удзеле ў кангрэсе, у тым ліку УЦСПС, ангельскі прафсаюз мэблёўцаў і індыйскі кангрэс прафсаюзаў. Апошняя арганізацыя, якая гуртуе індыйскі прафэсыянальны рух, паслала на кангрэс двух дэлегатаў, якія былі, аднак, ангельскай паліцыяй арыштаваны і кінуты ў астрог Замест іх індыйскія прафсаюзы паслалі яшчэ двух дэлегатаў, якія ўжо едуць у Эўропу.

Паўднёва-афрыканскае аб'яднаньне прафсаюзаў, унітарная канфэдэрацыя працы Францыі, кітайскае аб'яднаньне прафсаюзаў; прафсаюзы Індыі і некаторыя прафсаюзы Лацінскай Амэрыкі таксама паведамілі аб пасылцы імі дэлегатаў. Дакладчыкамі па пытаньні аб задачах прафсаюзаў у зьвязку з барацьбою проці імпэрыялізму намечаны: Мяльнічанскі—ад УЦСПС, Манмусо—ад унітарнае канфэдэрацыі працы Францыі, Госіп—ад ангельскага руху меншасьці і Мусо—ад прафсаюзаў Індыі.

ЛІКВІДАТАРЫ ЗАХАПЛЯЮЦЬ ПАРТМАЕМАСЬЦЬ.

ПРАГА. Орган ЦК Чэхаславакіі „Рудэ Право" паведамляе, што ліквідатары, якія пацярпелі паражэньне на палітычным фронце, захапляюць розныя прадпрыёмствы партыі, у першую чаргу партыйныя друкарні. Так, яны занялі партыйную друкарню ў Гладно, карыстаючыся тым, што партыя назначыла іх раней «юрыдычнымі асобамі», якія згодна чэхаславацкага закону зьяўляюцца фармальнымі ўласьнікамі партыйнае маемасьці.

На працягу апошняга часу ЦК КП Чэхаславакіі даў гладненскай друкарні пазыку ў разьмеры 400 тысяч крон. Ліквідатары, захапіўшы друкарню, адмаўляюцца цяпер прызнаць доўг і ў дадатак да ўсяго ня хочуць друкаваць у захопленай імі друкарні партыйны орган «Свабода».

ВЕСТКІ АДУСЮЛЬ.

ЧЫРВОНЫ ДЗЕНЬ ДРУКУ.

ВЕНА, 5-УП. 28-га ліпеня ў Вене адбудзецца „чырвоны дзень друку", які наладжваецца „Ротэ Фанэ" і мае на мэце пашырыць кола чытачоў газэты і замацаваць уплыў кампартыі.

КАМПАРТЫЯ АЧЫШЧАЕ СВАЕ ШЭРАГІ.

ВЕНА, 4-7. Венская арганізацыя камуністычнае партыі выключыла з партыі старшыню Шэнфэльдэра і Паўля Кона за іх адмову спыніць фракцыйную дзейнасьць.

ПАРТУГАЛЬСКІ ЎРАД ПАДАЎСЯ Ў АДСТАЎКУ.

ПАРЫЖ, 5-УП. Водлуг вестак, атрыманых агенцтвам Гаваса з Лісабону, партугальскі ўрад падаўся ў адстаўку.

НАВАЛЬНІЦА ЗЬНІШЧЫЛА ЗАСЕВЫ.

БЭРЛІН, 5-УП. Учора над Баварыяй і Вюртэмбэргам прайшла вельмі вялікая бура з градам, якая зрабіла вялікую шкоду засевам. Асабліва пацярпелі райёны Ульмы, Нюрэнбургу і Верхняга Пфальцу, дзе зусім зьнішчан ураджай. Шмат-дзе бура пазьдзірала дахі з дамоў. Сем'і засталіся бяз прытулку. Забіта шмат дробнае жывёлы. У Альтдорфе і ваколіцах паранена 40 чалавек. Вада заліла Альтдорф і дасягнула ўзроўню ў мэтр вышыні. Недалёка ад Альтдорфу ў полі забіты маланкаю селянін з жонкаю. У Дынгельсбюле град пакрыў вуліцы.

Прывітаньне Ураду БССР.

У дзень пуску першага ў Беларусі фасфарытнага млыну ўрачыстае пасяджэньне Мсьціслаўскага райвыканкому разам з партыйнымі, камсамольскімі, прафэсыянальна-грамадзкімі арганізацыямі і працоўнымі Мсьціслаўшчыны запэўнівае, што мы і ў далейшым будзем працаваць на індустрыялізацыі краіны і аднаўленьні сельскае гаспадаркі і выконваць плян далейшага ўзьнімцьця савецкага будаўніцтва.

ПРЭЗЫДЫУМ.

У САЮЗНЫХ РЭСПУБЛІКАХ.

НА ЗЬЕЗДЗЕ ПРАЦОЎНЫХ ПАЛЯКАЎ РСФСР І УССР

Прывітаньне толькі працоўным Польшчы.

МАСКВА, 4-7. На ранішнім пасяджэньні зьезду працоўных палякаў РСФСР адбываліся спрэчкі па дакладу т. Сахацкага аб міжнародным і ўнутраным становішчы СССР. У спрэчках выступалі дэлегаты Сібіру, Ленінграду, Паваложжа, Каўказу, Масквы і іншых мясцовасьцяў. Выступаўшыя аднадушна адзначалі вялікі ўдзым культурнага будаўніцтва сярод польскіх працоўных мас і актыўны ўдзел палякаў-працоўных ва ўрадзе РСФСР. Зазначалася таксама на вялічэзную розьніцу становішча нацменшасьцяў у Польшчы і ў СССР і на вольную творчую працу палякаў СССР рука аб руку з усімі працоўнымі Саюзу.

Дэлегат ад ленінградзкіх чыгуначных рабочых Вавілян заявіў: „Ленінградзкія рабочыя-палякі загадалі мне перадаць пралетарскае прывітаньне працоўным Польшчы праз таварышоў, якія едуць на зьезд у Варшаву. Няхай перададуць прывітаньне толькі працоўным Польшчы, бо толькі іх мы лічым сваімі братамі".

Ва ўхваленай па дакладу т. Сахацкага рэзалюцыі зьезд адзначыў няўхільную мірную палітыку савецкага ўраду, не зважаючы на розныя выпады нашых ворагаў, і заявіў, што працоўныя палякі СССР лічаць Савецкі Саюз, дзе ва ўладзе стаяць рабочыя і сяляне, сваёю сапраўднаю і адзінаю бацькаўшчынаю.

На вячэрнім пасяджэньні зьезд выслухаў даклад мандатнае камісіі і іншыя даклады. Зьезд абраў дэлегатам на варшаўскі зьезд палякаў наступны таварышоў: Растонэс, рабочы ад вар штату Пуцілаўскага заводу з 45-цігадовым вытворчым стажам, Ляднеўскі, рабочы, находзіць з Варшавы, былы палітычны ссыльны, Пшэбышэўскі, сын вядомага польскага пісьменьніка, рэктар маскоўскае кансэрваторыі, Ружкевіч, рабочы Пуцілаўскага заводу, раней працаваў у Лодзі і выслан ад туль царскім урадам. Абраньне гэтых таварышоў было спаткана адзінадушнымі гучнымі воплескамі ўсіх залі пасьля чаго зьезд зачыніўся, і ўсе яго ўдзельнікі з вялікім уздымам сьпявалі «Інтэрнацыянал».

Патрабуем дапушчэньня на варшаўскі зьезд.

КІЕЎ. 5-7. У адказ на ліст, атрыманы ўсеукраінскім арганізацыйным камітэтам ад арганізацыйнага камітэту варшаўскага кангрэсу, усеукраінскі зьезд працоўных-палякаў аднагалосна зьвярнуўся да арганізацыйнага камітэту зьезду заруб[illegible] палякаў у Варшаве з тэлеграмаю, у якой, між іншым, зазначана:

„Прычыны вашае адмовы выкрываюць сапраўдныя мэты, якія вы ставіце перад варшаўскім зьездам. Яны выяўляюць фашысцкі імпэрыялістычны твар арганізацыйнага камітэту зьезду і паказваюць, што вы хочаце выкарыстаць зьезд з мэтаю падрыхтоўкі новае злачыннае вайны, з мэтаю паклёпу і нацкоўваньня на СССР—бацькаўшчыну працоўных усіх нацыянальнасьцяў. Вы хочаце навакол вашага зьезду мабілізаваць затуманеныя польскія працоўныя масы, эміграцыю і польскія нацменшасьці, баючыся, што гэтыя масы пачуюць ад нашых дэлегатаў праўду аб СССР, аб яго правільнай нацыянальнай палітыцы — вось сапраўдныя прычыны вашае адмовы.

Усеукраінскі зьезд катэгарычна патрабуе перагляду пастановы аб недапушчэньні нашай дэлегацыі на варшаўскі зьезд".

З ЛІСТУ РАБОЧЫХ ПЕРАМЫШЛЮ.

СССР—адзіная краіна ў сьвеце, дзе ўсе нацыянальнасьці роўныя

КІЕЎ, 4-УП. Група рабочых гораду Перамышлю (Галіцыя) прыслала рабочым Кіеву ліст, у якім, між іншым, зазначана: „Напярэдадні 15-х угодак сусьветнае вайны, перад памяцьцю закапаных у магілы на палёх Галіцыі і ўсяе Украіны загінуўшых людзей мы клянёмся, што ўсімі сіламі будзем змагацца супроць новае вайны. Мы ведаем, што СССР зьяўляецца адзінаю краінаю ў сьвеце, у якой усе нацыянальнасьці атрымалі поўную магчымасьць свайго эканамічнага і культурнага разьвіцьця, у той час, як у нас пануе пячываны тэрор. Мы глыбока ўпэўнены, што настане той час, калі мы з Перамышлю здолеем працягнуць вам сваю братэрскую руку і злучыцца ў адзіным непарыўным братэрскім саюзе. Прэч праклятыя войны. Прэч праклятыя капітал. Няхай жыве наш верны прыяцель і абаронца міру—СССР"

Не забываюць сваіх клясавых таварышоў.

АДЭСА. МОПР'аўскія ячэйкі распачалі між сабою спаборніцтва на лепшае правядзеньне дню 1-га жніўня. У некаторых вёсках сяляне па сваёй ініцыятыве засеялі па сваім полі палоскі, ураджай з якіх пойдзе ў фонд МОПР'у. Разам такімі палоскамі засеяна 120 гэктараў. Збор ураджаю прыстасоўваецца да міжнароднага антыкаледнага дню.

Працоўныя спатыкаюць свой урад.

ТЫРАСПАЛЬ, 4-7. Пераезд ураду МССР у Тыраспаль абярнуўся ва ўсенароднае сьвята. Поезд з малдаванскім урадам урачыста спатканы шматлікімі масамі працоўных.

РАСТЛУМАЧЭНЬНІ НАРКАМАТАЎ.

МАСКВА, 5-7. Наркамфін РСФСР растлумачыў, што скаргі, якія падаюцца на маруднасьць, бюракратызм і валакіту дзяржаўнага апарату, а таксама заявы аб паскоранай справы вызвалены ад гербавага збору.

* * *

МАСКВА, 5-7. Наркамправы РСФСР растлумачыў, што асобы, якія скончылі школы II ступені (або 9-цігодкі) з прафэсыянальным ухілам, падлягаюць рэгістрацыі ў трох сэкцыях біржы працы без экспэртызы, калі яны пададуць пасьведчаньне аб скончэньні школы і не знаходзяцца ўтрыманцамі асоб, якія жывуць на непрацоўныя прыбыткі.

ПРЭЧ ДЫПЛЁМАТЫЧНЫ ТУМАН.

Тронная прамова ангельскага караля ці, інакш кажучы, афіцыйная праграма „рабочага" ўраду кідае яскравы сьвет на яго спэцыфічную тактыку ў пытаньні аб англа-савецкіх адносінах. Яна дае вельмі добры матар'ял для характэрыстыкі „сутнасьці" гэтага ўраду і адкрывае тую маску няшчырасьці і падману, з якою ўрад выходзіць на палітычную арэну ў якасьці паслухмянае зброі ангельскае буржуазеі, рыхтуючай новыя бічы і скарпіёны проці сваёй рабочай клясы і вайну проці Савецкага Саюзу.

Макдональд і іншыя прадстаўнікі рабочае партыі ў часе выбарчае кампаніі ня раз абяцалі ангельскім рабочым неадкладна пасьля прыходу да ўлады аднавіць перарваныя па віне цьвёрдалобых налётчыкаў і фабрыкантаў фальшывых дакументаў англа-савецкія адносіны. Але вось мінае тыдзень за тыднем, а „рабочы" ўрад усё топчыцца на адным месцы. Пушчаюцца ў абарот інсьпіраваныя паведамленьні аб тым, што Макдональд ніяк ня можа вырашыць пытаньня, пакуль не пагутарыць з прэзыдэнтам Гуверам, да якога ён адчувае асаблівыя пачуцьці і зьбіраецца зьезьдзіць у госьці (пункт старога чэрчылеўскага пляну адзінага антысавецкага фронту).

Апроч таго, да справы прыцягваюцца ангельскія дамініёны, не зважаючы на тое, што з іх боку ніякіх перашкод не прадбачыцца. Нарэшце, агалашаецца складзеная габінэтам тронная прамова, у якой пытаньню англа-савецкіх дачыненьняў даецца такая фармулёўка: „Урад разглядае ўсе ўмовы, пры якіх могуць быць адноўлены дыпляматычныя зносіны з савецкім урадам, і зносіцца па даным пытаньні з дамініёнамі з Індыі".

У чым справа?

Навошта пушчаецца такі густы туман, што нават выдатныя дзеячы рабочае партыі і ранейшы міністр першага «рабочага» ўраду Уолхед прымушан заявіць: „Тая частка троннае прамовы, якая датыкаецца ўзаемадачыненьняў з Расеяй, надзвычайна туманная, асабліва, калі яе разумець у асьвятленьні тых абавязацельстваў, якія ўзяў на сябе кожны сябра рабочае партыі ў часе выбараў». Мы павінны рашуча і выразна заявіць, што ўсе гэтыя гутаркі аб „умовах" зьяўляюцца бязумоўным падманам, зацямненьнем вачэй ангельскіх рабочых мас, якія даверыліся «рабочай» партыі. Адна пастаноўка гэтага пытаньня можа мець толькі адзін сэнс сабатаваць выкананьне перадвыбарчых абяцаньняў, аб якіх гаворыць Уолхэд.

Яскравым пацьверджаньнем гэтага зьяўляецца выступленьне Бальдвіна і адказ Макдональда на гэтае выступленьне. Бальдвін задаў запытаньне: „Ці прытрымліваецца прэм'ер у пытаньні аб адносінах да СССР прынцыпу, пераказанага ў яго ноце наконт ліста Зіноўева"? На гэта Макдональд адказаў здавальняюча. Такім чынам, галава «рабочага» ўраду пачынае сваю дыпляматычную дзейнасьць у галіне англа-савецкіх дачыненьняў спасылкаю на ноту, аснованую на „лісьце Зіноўева".

Між тым, аб гэтай ганебнай фальшыўцы сам Макдональд у свой час заявіў, што яна „зьяўляецца прадуктам таго, што ў сучасны момант лічыцца палітычным машэньніцтвам, якога па свайму халоднаму разьліку і праднамеранасьці, як відаць, нельга раўнаць ні з чым у палітычнай гісторыі Англіі". (Прамова ў парляманце 19-га сакавіка 1928 г. наконт выкрытага машэньніцтва аўтара ноты аб „лісьце Зіноўева" Грэгоры).

І калі ўрад, які называе сябе „рабочым", лічыць магчымым, варочаючыся да скандальнага фальшывага «лісту Зіноўева» пусьціцца ў дыскусію наконт «умоў», дык савецкі ўрад можа з поўным правам падаць свае розныя контр-умовы ў зьвязку з сапраўднымі дамаганьнямі. Ён можа паставіць умоваю аднаўленьня нармальных англа-савецкіх зносін выдачу ангельскім урадам абавязацельства ня ўдзельнічаць у антысавецкай інтэрвэнцыі, не наладжваць наскокаў на савецкае гандлёвае прадстаўніцтва, ня ўзламываць у ім сэйфаў, ня зьдзекваецца над савецкімі супрацоўнікамі. Ён можа запатрабаваць, каб быў пакладзен канец злачыннай антысавецкай працы ангельскіх дыпляматычных агентаў заграніцаю, якія зьяўляюцца вялікаю пагрозаю для справы міру (падбухторская роля ангельскіх дыпляматычных прадстаўнікоў у наскоках кітайскае ўлады на савецкія прадстаўніцтвы у Кітаі, спроба спрабаваць дыпляматычны разрыў між СССР і іншымі краінамі, наладзіць фінансавую блёкаду і г. д. і г. д.)

Савецкі ўрад ніякае гульні не праводзіць і ставіць пытаньне зусім проста і выразна. Не затым, што ён забыў усе злачынствы ангельскага імпэрыялізму ў адносінах да Савецкага Саюзу, а затым, што ён сапраўды імкнецца да міру і аднаўленьня англа-савецкіх дыпляматычных зносін, Савецкі ўрад не патрабуе ласкі з чыйго-небудзь боку. Ён добра разумее, што як правакацыйны разрыў дае эканамічную шкоду абодвым бакам і стварае пагрозу захаваньню міру, так і ліквідацыя яго можа спрыяць справе міру і ажыўленьню гандлю між

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЬЦЁ.

Партыйная маса сур'ёзна адносіцца да чыстні партыі.—Чырвонаармейцы правяраюць сваіх кіраўнікоў. —Яшчэ існуюць ячэйкі і камуністы «на паперы».—Вывучаем пастановы XVI партканфэрэнцыі.

Правяраюць сваіх кіраўнікоў.

(Ворша).

29 чэрвеня клюб будаўнікоў хутка запоўніўся партыйцамі і беспартыйнымі. Прышлі на куставы сход партячэек, дзе правяраўся склад кіруючых партпрацаўнікоў.

Першым выклікаецца член бюро акругкому т. **Аграноўскі**. У партыі з 1919 г. З 1914 да 1918 г. быў у партыі „Бунд", пасьля гэтага ў камсамоле. Перад пасылкай у Воршу працаваў у Белкаапсаюзе. Сын служачага, у Чырвонай арміі ня быў.

Яму задаюць пытаньні:

— Якую работу вялі ў «Бундзе»?

— Да якіх служачых адносіцца бацька?

— Што за справа ў вас была ў Белкаапсаюзе?

Тав. Аграноўскі дае тлумачэньні:

— Асаблівай работы ў „Бундзе" ня вёў, бо быў яшчэ малады. У час выбараў у «учредзілку» агітаваў за тое, каб галасавалі за сьпісак № 5. Бацька быў настаўнікам, пасьля—бухгальтарам, цяпер—пэнсыянэр страхкасы.

Што датычыцца справы ў Белкаапсаюзе, дык вось што было там. Адзін з членаў праўленьня забраў сабе на кватэру вялікае люстра-трумо з з чырвонага кутка. Аб гэтым напісалі ў насьценгазэту, а пасьля заметку перадалі мне, як сэкратару ячэйкі, для прыняцьця мер. Я ўжо ў той час нічога ня мог зрабіць, але забыў заметку перадаць назад у рэдкалегію. Гэта была мая памылка, я прызнаюся.

Далей правяраюцца: т. **Бутар**—заг. АПА акругкому. У партыі з 1918 г., сын саматужніка.

Тав. **Зак** Бася. Кандыдат у члены бюро акругкому, работніца, працуе на броварным заводзе, сэкратар ячэйкі.

Супроць Зак выступае рабочы Фамін і кажа, што Зак на заводзе сярод рабочых стварае склоку, што з часу, калі яна паехала ў водпуск, працаваць стала лягчэй.

Адзін за другім выступаюць рабочыя заводу, дзе працуюць і Зак і Фамін. Усе яны кажуць, што Фамін мае асабістыя рахункі з Зак, бо яна яго добра прабірала за тое, што ён на першы дзень „вялікдня" сарваў „нядзельнік" на карысьць падшэфнай вёскі. Гэта Фамін вёў сярод рабочых агітацыю, каб на „вялікдзень" не працавалі і што ён асабіста ня будзе працаваць. Рабочыя паслухалі яго і не пашлі на працу, але Фамін усё ж такі зьявіўся, каб адвесьці ад сябе абвінавачаньне ў зрыве „нядзельніка".

Рабочыя заводу рэкамэндавалі Зак як сумленную партыйку, якая добра разьбіраецца ў партыйных пытаньнях, як чулага і добрага таварыша.

Тав. **Кавалёў**. Член партыі з 1922 г. Член бюро акругкому, загадчык вясковага аддзелу, сын селяніна. Бацька яго—актыўны вясковы працаўнік.

Тав. **Кохан**. У партыі з 1919 г. Служыў у Чырвонай арміі, селянін. Цяпер—член бюро акругкому і старшыня акруговага савету прафсаюзаў.

Тав. **Мангус**. У партыі з 1905 г. Член бюро акругкому. Начальнік акраддзелу ДПУ. Селянін. Служыў у старой і Чырвонай арміі. У апошняй—на адказных пасадах.

Тав. **Розаў**. У партыі з 1925 г. Кандыдат у члены ЦК КП(б)Б. Рабочы, сын саматужніка. У сучасны момант—сэкратар партыйнай ячэйкі. Добры партыец.

Садоўскі. У партыі з 1925 г. Сэкратар акругкому ЛКСМБ. Рабочы, бацька—каменшчык. Характарызуецца, як добры працаўнік і сумленны партыец

Яму задаюць пытаньне: ці не дае ён прыкладу дрэнных паводзін для моладзі?

— Цяпер за мной нічога няма дрэннага. Гады два таму назад прабаваў выпіваць, а зараз ня п'ю зусім.

Тав. **Сэрлін**. У партыі з 1918 г. Член АКК, рабочы, 25 гадоў.

— Гэткіх больш партыйцаў!—чуюцца галасы з месц.

Тав. **Сьцефановіч**. У партыі з 1917 г. Сам рабочы і з рабочай сям'і. Член прэзыдыуму АКК. Яго таксама характарызуюць толькі з добрага боку.

Тав. **Сьвірыдаў**. У партыі з 1917 г. Селянін, старшыня АКК і член ЦКК КП(б)Б. Былы чырвоны партызан.

Пасьля іх правяраюцца яшчэ тав. **Хандогі**, член бюро акругкому і старшыня акрвыканкому і т. **Шабун**—член прэзыдыуму АКК—абодвы рабочыя.

А. Калюжны.

Вайскоўцы правяраюць.

(Ворша).

30-га чэрвеня ў палатняны горад прыехала камісія ЦКК КП(б)Б правяраць кіруючых партпрацаўнікоў.

На сход сабраліся ўсе чырвонаармейцы і камсклад.

Першым правяраецца тав. **Ананічаў**. Ён паходзіць з бядняцкай селянскай сям'і. З 1917 г. актыўна ўдзельнічаў у бойках Чырвонай гвардыі за ўладу саветаў. Быў на фронце па барацьбе з Юдзенічам. Выздаравеўшы пасьля пораненьня—зноў на фронт. У 1920 годзе ўступіў у партыю. Увесь час у Чырвонай арміі па кіруючай палітпрацы.

— Чаму раней ня ўступіў у партыю?

— Як праводзіць растлумачальную працу аб чыстцы партыі?

— Добры партыец,—кажуць чырвонаармейцы.

Далей правяраецца тав. **Бабкоў**. Паходзіць з сям'і рабочага-ліцейшчыка. Сам працаваў токарам. У партыю ўступіў у 1919 г. Службу ў Чырвонай арміі пачаў з радавога чырвонаармейца, цяпер—камісар палка.

— Якая сувязь з чырвонаармейскай масай?

— Ці праўда, што тав. Бабкоў часта езьдзіць на палкавым кані па асабістых справах?

Полк прызнае тав. Ананічава і тав. Бабкова добрымі, сумленнымі таварышамі, якія зьвязаны з чырвонаармейскай масай.

Ст. Іка.

Калектыўна прапрацоўваем.

Як толькі зьявіліся кніжкі аб выніках XVI партканфэрэнцыі, кожны курсант АБВШ задаўся мэтаю вывучыць пастановы канфэрэнцыі.

У сучасны момант калектыўна прапрацоўваем даклады і пастановы. Галоўным чынам цяпер прапрацоўваецца пяцігадовы плян разьвіцьця народнае гаспадаркі і ўсё новае, што ўнесена ў гэты пяцігадовы плян XVI партканфэрэнцыяй. У ліквпунктах вывешваюцца дыяграмы разьвіцьця народнае гаспадаркі, вытрымкі з прамоў на XVI парканфэрэнцыі. Курсанты вывучаюць кожнае слова і кожную лічбу з вялікай зацікаўленасьцю. Кепска толькі, што літаратуры па гэтым пытаньні мала, яе не хапае. Дзяржвыдавецтву па магчымасьці варта тыраж павялічыць.

Р. Пятроўскі.

Пад „абстрэлам".

(Гомель).

Праверка кіруючага складу пад-арганізацыі прайшла пры надзвычайнай актыўнасьці партыйцаў і беспартыйных мас.

Праверачныя сходы былі перапоўнены працоўнымі. Кожны правярэмы падлягаў дзелавой крытыцы. Прысутныя задавалі шмат пытаньняў і цікавіліся, як той ці іншы партыец праводзіць дырэктывы партыі. На сходах адзначаліся адмоўныя і станоўчыя бакі правяраемага.

На сходах вайсковых партячэек пад абстрэл былі ўзяты камандзір і ваенком Ж-й часьці т. Шпілеўскі. Апошні часам скарыстоўваў сваё службовае становішча. Некаторых таварышоў вінавацілі ў недастатковай сувязі з працоўнымі.

На сходах былі выпадкі хлусьні і «сведення личных счетов» з правяраемым.

Але-ж гэтым спробам на сходах даваўся належны адпор.

Зараз распачата праверка складу праверачных троек. Куставыя сходы партячэек праходзяць пры шырокім удзеле з боку беспартыйных рабочых.

Праца Ленінскае партячэйкі.

(Слуцкі раён).

Ленінская партячэйка налічвае 10 чалавек. Расла ячэйка нездавальняюча, як па колькасьці, гэтак і па якасьці. За 2 гады ячэйка прыняла 12 чалавек і ніводнага батрака. Характэрна, што з падаўшых заявы, служачыя ўсе прыняты, у той час, як некаторым беднякам-сялянам адмоўлена ў прыёме.

Спэцыяльна пытаньне росту ячэйкай не абгаварвалася ні разу. Толькі ў апошні час, пасьля абгляду, ячэйка занялася гэтым пытаньнем.

У працы ячэйкі ня было ніякага пляну. Працавалі па меры набегу таго ці іншага пытаньня па дырэктывах з райкому.

Адсутнічала ўнутры-партыйная дэмакратыя.

Характэрны момант: амаль усе даклады ў ячэйцы рабіў сам сэкратар; ні ў падрыхтоўку пытаньняў, ні ў разгляд сябры ячэйкі ня ўцягваліся. Адгэтуль адсутнічала ўнутры-ячэйкавая дэмакратыя, назіраліся выпадкі камандаваньня, адсутнічалі ўнутры-партыйная крытыка і самакрытыка. У ячэйцы меліся элемэнты сямейнасьці. Працавалі шляхам „дамоўленасьці",—і як вынік, на гэтай падставе адсутнічала адказнасьць за працу асобных сяброў ячэйкі.

Заняліся склокай, а ня поацай.

Мелася склока паміж сэкратаром ячэйкі і загадчыкам сямігодкі. На гэту склоку ячэйка аддала шмат часу, чым упусьціла важныя моманты практычнае працы.

Левінскі сельсавет мае значную праслойку кулакоў, былых людзей. Клясавая барацьба даходзіць да адкрытых выступленьняў варожых элемэнтаў. Рэч вядомая, што недахопы ў працы ячэйкі выкарыстоўваюцца варожымі элемэнтамі, з мэтаю падрыву яе працы.

Без выхаваўчай працы.

Адсутнічала сталая партыйна-выхаваўчая праца. Партвучоба, распачатая з пачатку пад вясну, зусім распалася і ніякіх захадаў да наладжваньня яе прымалася. Адгэтуль несьвядомасьць часткі партыйцаў, асабліва кандыдатаў, у важнейшых пытаньнях партработы ў вёсцы.

Кепска кіравала парт'ячэйка працай ячэйкі камсамолу. Былі выпадкі, што асобныя камсамольцы процідастаўлялі сябе парт'ячэйцы, ня выконвалі рашэньняў партячэйкі

Культурнае будаўніцтва іх ня цікавіла.

Справай культурнага будаўніцтва ячэйка амаль не займалася. Два партыйцы, якія працавалі ў 7-мігодцы, ня мелі дамоўленасьці паміж сабою. Загадчык 7-мігодкі,—партыец, не праводзіў партдырэктыў па школе. Ідэалёгічнае выхаваньне пайшло як міма ячэйкі, так і міма тых партыйцаў, якія там працавалі.

На зачыненым сходзе ячэйкі абгаварвалі пытаньні чыстні.

Характэрным момантам баязьлівасьці, пры наяўнасьці кепскага ўнутры ячэйкі становішча, зьяўляецца тое, што пытаньне чысткі партыі ставіліся на зачыненым сходзе ячэйкі і толькі пасьля прапановы ў другі раз райкому, ячэйка абгаварыла пытаньне чысткі партыі на адчыненым сходзе і правяла сходы беднаты па гэтаму пытаньню.

Таксама малыя вынікі па калектыўнай здачы збожжа,—каля 25 процантаў заданьня. У справу хлебазагатовак ня ўцягвалася каапэрацыйная бядняцка-серадняцкая частка насельніцтва.

Маюцца і добрыя бакі ў працы.

Ня гледзячы на шэраг недахопаў працы, ячэйка правяла працу па калектывізацыі, пашырэньні існуючых калгасаў, па аграмаджваньні маемасьці. Правяла працу па далучэньні часткі пасёлку „Славінскага" да калектыву. Недахопам зьяўляецца тое, што ў існуючых 4 калгасах вельмі малая партыйная праслойка. Добра ячэйка паставіла працу з беднатой, праўда, часта не замацоўваючы дасягненьняў. Але навакол асноўных пытаньняў працы ячэйка добра арганізавала беднату. Добра правяла перавыбары сельсаветаў, самаабкладаньне.

У справе каапэраваньня ячэйка праводзіла працу добра. Павялічыўся лік пайшчыкаў у спажывецкай каапэрацыі на 8,8 проц.

Па сельска-гаспадарчай каапэрацыі таксама маецца рост пайшчыкаў. Разьмеркаваньне крэдыту поўнасьцю забясьпечыла клясавы прынцып.

Пытаньнямі нацпалітыкі ячэйка займалася, абслугоўваньне нацменшасьцяў па сельсавету і самым мястэчку забясьпечана.

Райком утварыў абгляд працы і становішча ячэйкі. Пераабраны датэрмінова бюро і сэкратар. Аднаго партыйца райком выключыў, былы сэкратар атрымаў партспагнаньне і зьняты з працы.

Праца ячэйкі ў сучасны момант, са зьнішчэньнем усіх заган і недахопаў, значна палепшылася.

Курганені.

Беспартыйныя вывучаюць.

Пастановы XVI партканфэрэнцыі ў № стралковым палку прапрацоўваюцца чырвонаармейскім і камандным складам. Прапрацоўка, галоўным чынам, праходзіць на лініі партыйнай асьветы, куды ў дастатковай меры прыцягваюцца і беспартыйныя. Пытаньнямі, якімі займалася XVI партканфэрэнцыя, беспартыйныя вельмі цікавяцца, а асабліва цікавіць пяцігадовы плян народнае гаспадаркі. На занятках па пяцігодцы задаецца шэраг пытаньняў.

У па-зашкольнай працы пытаньні XVI партканфэрэнцыі займаюць дастатковае месца. Праводзяцца гутаркі, палітбойкі паміж чырвонаармейцамі.

У кожным лендоміку можна бачыць дыяграмы па паліткантрольных лічбах пяцігадовага пляну будаўніцтва нашае гаспадаркі.

Лёзунгамі і плякатамі таксама яскрава адбіваюцца рашэньні XVI партканфэрэнцыі.

Ротныя ільлічоўні ў дастатковай меры справіліся з задачамі, якія былі пастаўлены перад імі па адбіцьці ў друку асноўных задач па вывучэньні рашэньняў XVI партканфэрэнцыі.

Усе гэтыя мерапрыёмствы, якія былі праведзены з боку партбюро палка, а таксама партячэек рот садзейнічалі чырвонаармейцам зразумець галоўныя задачы партыі па сацыялістычнаму будаўніцтву.

Ячэйка на паперы.

(Калінкавіцкі раён, Мазыршчына).

У Дудзіцкай ячэйцы КП(б)Б маецца некалькі членаў і кандыдатаў. Грамадзкай працы ячэйка не вядзе на вёсцы ніякай. Агульныя сходы мала калі праводзіць.

Неабходна каму належыць зьвярнуць увагу і даць напрамак у працы, каб ячэйка ня была толькі на паперы.

Камсамолец.

ПРЫВІТАНЬНЕ ЦВК І СНК БССР

АД УСЕБЕЛАРУСКАГА ЗЬЕЗДУ ПРАЦОЎНЫХ ПАЛЯКАЎ.

Усебеларускі зьезд працоўных палякаў горача і шчыра вітае Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР—кіруючыя органы рабоча-сялянскай улады.

Дыктатура пралетарыяту ажыцьцёўленая ў Кастрычніку 1917 году зьнішчыла нацыянальны ўціск. Працоўныя палякі БССР з іншымі нацыянальнасьцямі атрымалі поўныя правы і магчымасьць шпаркага гаспадарчага і культурнага разьвіцьця.

Працоўныя палякі БССР карыстаюцца гэтымі правамі, карыстаюцца поўнасьцю. Довадам таго можа служыць іх актыўны ўдзел у сацыялістычным і савецкім будаўніцтве і тыя вялікія дасягненьні, якія атрымалі польскі рабочы і селянін БССР у галіне гаспадаркі і культуры, і якія дасягнула ўся савецкая Беларусь у сацыялістычным будаўніцтве, дзякуючы дружнай працы працоўных усіх нацыянальнасьцяй. Гэтыя дасягненьні магчыма было атрымаць толькі ва ўмовах дыктатуры пралетарыяту, ва ўмовах поўнай гаспадарчай і культурнай роўнасьці працоўных усіх нацыянальнасьцяй.

Мы цалкам падтрымліваем пяцігадовы плян сацыялістычнага будаўніцтва і прыложым з свайго боку ўсе намаганьні і стараньні, каб агульнымі сіламі падняць нашу рабоча-сялянскую бацькаўшчыну на вышэйшую эканамічна-культурную ступень, каб дагнаць і перагнаць буржуазныя краіны. Працоўныя палякі Савецкай Беларусі добра ўяўляюць тыя труднасьці, якія стаяць на шляху нашага будаўніцтва. Толькі курс на індустрыялізацыю краіны, на колектывізацыю сельскай гаспадаркі запэўнівае, што мы збудуем сацыялізм.

Выконваючы волю працоўных мас палякаў БССР, зьезд заяўляе ўраду, што працоўнае польскае насельніцтва лічыць сваёй адзінай і сапраўднай бацькаўшчынай Савецкую Беларусь і ня пойдзе на ашуканства фашысцкіх фраз аб народным адзінстве. У сваім адказе на спробы польскага фашызму, які склікае ў Варшаве зьезд палякаў, што жывуць за межамі, рабочыя і бядняцка-серадняцкія сялянскія масы і працоўныя польская інтэлігэнцыя БССР яшчэ больш узмоцняць сваю працу над узмацненьнем дыктатуры пралетарыяту, над сацыялістычным будаўніцтвам пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, яшчэ больш моцна будзе абараняць мірную палітыку савецкага ўраду і ўзмацняць абароназдольнасьць СССР.

Нашы браты—гэта працоўныя ўсіх нацыянальнасьцяй БССР, з якімі мы будуем сацыялізм, нашы браты - работнікі, сяляне і прыгнечаныя народы ўсяго сьвету, якія змагаюцца супроць капіталу, а ня польскія паны - фашыстыя, капіталісты і памешчыкі.

Стальным молатам дыктатуры пралетарыяту мы куем новы грамадзкі лад, і тым молатам здолеем разьбіць галаву польскаму фашызму і сусьветнаму капіталу, калі ён адважыцца напасьці на нашу сацыялістычную бацькаўшчыну—СССР.

Няхай жыве рабоча-сялянскі ўрад БССР!

Усебеларускі зьезд працоўных палякаў.

ПА БЕЛАРУСКАЙ ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Вучот скончан.

Кампанія вучоту аб'ектаў ападаткаваньня паказала, што вучот праходзіў у гэтым годзе ў больш спрыяльных умовах, чымся ў мінулым годзе. Папулярызацыя закону аб сельска-гаспадарчым падатку ў сувязі з праблемай ураджайнасьці была асноўным стрыжнем гэтай важнай кампаніі. Так, у В-Крушынаўскім сельсавеце было праведзена звыш 20 сходаў сялян, на якіх выключна ставіліся пытаньні, зьвязаныя з новым падаткам і ўздымам ураджайнасьці. Вось чаму да вучоту сялянства было лепш падрыхтавана, яно сьмялей пісала ўсе аб'екты ападаткаваньня, якія ёсьць у гаспадарцы, але заможнікі, як і трэба было чакаць, стараліся захаваць ад вучоту жывёлу, асабліва сьвіней.

Праверачнай камісіяй сумесна з селькорамі былі праверены ўсе гаспадаркі, шляхам «налётаў», якім выкрыта да 50 сьвіней, 30 авечак і некалькі штук рагатай жывёлы, пры чым на ўсю выяўленную жывёлу складзены акты, за што РВК накладзены адпаведныя штрафы. Разам з вучотам праведзены сходы беднаты, на якіх абгаварваліся мэтады вучоту і задачы вучотных камісій. На гэтых сходах абмяркоўваліся таксама сьпісы бядняцкіх гаспадарак, якіх аслабонена да 80, што складае 21-22 проц. усіх гаспадарак. Праведзен пленум, на якім зацьверджаны сьпісы аслабоненых і матар'ял па вучоту пакіраван ў РВК для налічэньня падатку.

Я. Крушына.

Вучот прайшоў добра.

(Слатоўскі с.-с., Аршаншчына).

Па нашым сельсавеце вучот пачаўся з пачатку мая месяца. На сходах пры вучоце беднота была арганізавана добра, дзе сьмела выкрывала кулацкія ўтойваньні.

Беднота шмат выкрыла ўтоеных сьвіней, а часткай буйнай рагатай жывёлы. Па ўсяму сельсавету 8 гаспадарак абкладзена індывідуальна.

Каб беднота была актыўна, былі прыкладзены ўсе сілы па растлумачэньню падатку як камсамольскай ячэйкай, так і партыйнай.

П. Ч.

Будуем торфападсьцілачны завод.

ВОРША, 3-7. Распачалася праца па пабудове торфападсьцілачнага заводу пры Дзяржаўнай Сальска-Гаспадарчай Акадэміі ў Горнах. Каштарысы пабудовы заводу ўжо зацьверджаны ў суме 7740 руб. Завод будзе падрыхтоўваць падсьцілачны торф для сялян. У першы год завод дасьць 150 тон торфу, а ў другі—480. Сабекаштоўнасьць тоны торфу ўстаноўлена ў першы год 16 р. 17 к., а далей павінна будзе зьмяншацца.

Калгас палепшыць жыцьцё жанчыны.

(Клічаўскі р., Бабруйшчына).

Пасьля перавыбараў сельсаветаў райвыканком наладзіў сыстэматычную працу сярод жанчын, абраных у саветы, рэвізійныя камісіі, сельсуд і г. д.

Практычныя пытаньні першае нарады зацікавілі жанчын вылучаных у выбарныя органы, і другая нарада прывабіла значна большую колькасьць жаночнага актыву.

Дзельна выказваліся жанчыны наконт правоў і абавязкаў выбарнае жанчыны, наконт ясьляў, пляцовак і іншых мерапрыёмстваў, накіраваных да палепшаньня быту жанчыны.

Асабліва востра стаіць пытаньне калектывізацыі гаспадаркі.

— Ня ўсе мы яшчэ разумеем, што толькі ў калгасах палепшыцца жыцьцё жанчыны,—кажа сялянка Акуліч (член сельсавету) з вёскі Стаялы.

А Юркевіч Юстына дадае: «Раней цяжка было жыць мне, а зараз у калгасе добра. У нас цяжарная жанчына мае водпуск на паўтара месяцы перад радамі і пасьля. Наступную нараду трэба склікаць у калгасе, каб кожная жанчына ўбачыла наша жыцьцё і ўпэўнілася ў яго выгадзе».

Нарада аднагодна ўхваліла сабрацца ў калгасе імя Дзяржынскага, каб убачыць новае жыцьцё і перабудаваць сваю жаночую долю на лепшы лад.

Л. Л.

Трактары на палёх калгасу.

(Смалявіцкі р., Менакругі).

Пасьля таго, як земляўпарадкаваньне кулакамі папамі і дзякамі ў в. Верхмень было сарвана, беднота рашыла арганізавацца ў калгас, які і быў арганізован супроць волі кулацтва.

Надыходзіла вясеньняя сяўба, кулакі сьмяяліся з беднаты, кажучы, што „У вас цягавай сілы няма і вы зьвернецеся да нас за дапамогай".

Але беднота не пабаялася і як зьдзіві-ліся кулакі, калі дзякуючы прынятым мерам з боку райкому партыі, на полі калгасу паявіліся два стальныя кані—трактары, якія зруйнавалі старыя дзедаўскія межы.

За два дні з паловай лемяхамі трактараў было ўзьнята 20 гэктараў цаліны і веснавая сяўба на полі калгасу была скончана раней, як у ваколічнага насельніцтва.

Маржевіч.

Сельска-гаспадарчая арцель „Беднота".

(Грэскі раён, Менская акруга).

Арцель арганізавалася ў 1928 годзе і ў сучасны момант налічвае шэсьць сямей. Зямлі яны атрымалі 144 гэктары, але ўся зямля знаходзіцца пад кустарнікам. Члены арцелі ўпэўнены ў свае сілы, што гэту зямлю распрацуюць і будуць мець добрае поле. 10 гэктараў ужо распрацавана. Астатняя площча скарыстоўваецца правільна. Частка адпушчана пад сенажаць, а на другой частцы пасуць каровы, якія арцель узяла ў Белмясгандлі лікам сто штук. Праца наладжана добра. Усе члены арцелі ўпэўнены, што калектыўнай працай магчыма збудаваць лепшае жыцьцё.

На сустрэчу сялянству.

Ворша, 3-VII. У інтарэсах насельніцтва, асабліва сялянства, якое пераважна ў горадзе бывае ў нядзелю, Прэзыдыум Акрвыканкому ўстанавіў прыём наведвальнікаў у Акрвыканкоме, Акрземаддзеле, Акруговым фінансавым аддзеле і ў РСІ па нядзелях з 10 гадзін раніцы да 2 гадзін дню. Работу на прыёму наведвальнікаў у АВК будуць праводзіць сябры прэзыдыуму АВК і Інспэктары Асьветы, Аховы здароўя, Сабезу і Паліт асьветы.

Такім чынам прыяжджаючыся ў горад сяляне за сваімі патрэбамі будуць мець магчымасьць спраўляць свае справы і ва ўстановах.

Прыкладная вёска ў правядзеньні культурных аграмерапрыёмстваў.

З 1924 г. вёска Бальшая Ліпаўка, Хоцімскага раёну, Магілеўшчына, пачынае праводзіць у жыцьцё шмат аграмерапрыёмстваў, як азімую ўспашку, пераход на шматпольле і прымяняць у ўгнаеньне торф.

Зараз гэта вёска мае шмат дасягненьняў у гэтай галіне. Амаль усе гаспадаркі перайшлі на шматпольле і сеюць канюшыну.

Усе гэтыя мерапрыёмствы значна ўзьнялі ўраджай у параўнаньні з ранейшымі гадамі. Усе вёскі, якія яшчэ не правялі гэтых аграмерапрыёмстваў, бярэце прыклад.

Ліпаўкі.

А. ХАЦКЕВІЧ.

Канчатковыя вынікі перавыбараў Саветаў Беларусі.*)

У выніку пасьпяхова праведзенай падрыхтоўчай работы і справаздачнай перавыбарчай кампаніі ў складзе сельскіх, местачковых і гарадзкіх саветаў ёсьць значныя зьмены ў бок палепшаньня, а ўласна:

1. Павялічэньне ў агульным складзе саветаў і рэвізійных камісій, а таксама і ў кіруючым складзе гэтых органаў рабочых, батракоў і беднаты: процант беднаты, вызваленай ад падатку, у агульным складзе сельсаветаў павялічыўся з 22,8 да 37,5 проц., с.-г. рабочых і батракоў—з 1,1 да 2,7 проц., астатніх рабочых—з 1,4 да 1,7 проц.; у складзе старшынь сельсаветаў—процант беднякоў, вызваленых ад падатку, павялічыўся з 22,1 да 37,8 проц., с.-г. рабочых і батракоў—з 0,5 да 3,9 проц., астатніх рабочых—з 1,4 да 2,3 проц.; у складзе рэвізійных камісій процант беднаты, вызваленай ад падатку, павялічыўся з 20,4 да 31,8 пр., рабочых і батракоў—з 3,6 да 4,2 пр.; у агульным складзе местачковых саветаў процант с.-г. рабочых і батракоў павялічыўся з 0,1 да 4,2 проц. і астатніх рабочых—з 15,3 да 19,8 пр.; у складзе неакруговых гарсаветаў процант рабочых з вытворчасьці павялічыўся з 26,1 да 31,1 проц., у складзе акруговых—з 28,8 да 34,0 проц.

Па нацсаветах, як дасягненьне, трэба адзначыць павялічэньне ў ліку выбарных сялян процанту вызваленых ад падатку: па яўрэйскіх саветах—з 18,75 да 50 проц., па польскіх—з 24,5 да 45,9 проц. і расейскіх—з 26,1 да 37,3 проц.; адсутнасьць плацельшчыкаў з платай звыш 10 рублёў на едака па яўрэйскіх (супроць 18,75 пр. у мінулым складзе) і зьмяншэньне гэтае групы з 26,1 да 19,2 проц. па латыскіх саветах; павялічэньне процанту батракоў і с.-г. рабочых ад 0,6 да 3,8 проц. па польскіх саветах, ад 0 да 1,4 проц. па яўрэйскіх, ад 0 да 0,8 проц. па расейскіх саветах і павялічэньне процанту іншых рабочых ад 0 да 0,8 проц. па польскіх, ад 22,1 да 32,4 проц. па яўрэйскіх і ад 0 да 1,4 проц. па расейскіх саветах.

2. Уцягненьне новых кадраў працоўных у склад нізавых саветаў і на кіруючыя пасады ў апошнія (выбраных першы раз членамі сельсаветаў—70,5 проц. і старшынямі—34,9 проц.).

3. Павялічэньне ў складзе сельсаветаў абсалютнага ліку членаў КП(б)Б і ЛКСМ (з 4.372 да 7.397) і процанту камуністаў і камсамольцаў у складзе: прэзыдыуму сельсаветаў (з 33,6 да 39,2 проц.), старшынь сельсаветаў (з 33,7 да 57,0 проц.); павялічэньне процанту камуністаў і камсамольцаў у гарсаветах акруговых—(з 57,6 да 60,5 проц.) і неакруговых—(з 36,1 да 40,3 проц.).

4. Дастаткова забясьпечана ў саветах прадстаўніцтва працоўных усіх нацыянальнасьцяў БССР з павялічэньнем іх абсалютнага ліку ў складзе сельскіх і местачковых саветаў.

5. Значнае павялічэньне колькасьці працоўных жанчын у агульным і кіруючым складзе саветаў (па сельскіх саветах з 7,2 да 19,7 проц. і ў складзе старшынь сельсаветаў з 0,8 да 7,0 проц.; па местачковых саветах—з 12,3 проц. да 26,1 проц.; па гарсаветах акруговых—з 17,1 да 25,3 пр. і неакруговых—з 12,7 да 22,3 проц.).

6. Большае ўцягненьне працоўных у сталую працу ў саветах шляхам пашырэньня як агульнага складу сельскіх і местачковых саветаў, так і складу прэзыдыумаў гэтых саветаў і райённых органаў улады. Вось асноўныя паказальнікі станоўчых вынікаў у перавыбарах саветаў.

Але, побач з дасягненьнямі, якія мы мелі ў пэрыяд перавыбарчай кампаніі, неабходна адзначыць і недахопы.

Наяўнасьць фактаў недавучоту некаторымі партыйнымі і камсамольскімі арганізацыямі абвастрэньня клясавай барацьбы, недастатковай увагі справе арганізацыі беднаты і ўзмацненьня бядняцка-серадняцкага блёку; зусім недастатковае выкананьне дырэктывы аб правядзеньні папярэдніх сходаў бядняцка-серадняцкага актыву. Пры падрыхтоўцы і правядзеньні кандыдатур наглядаліся ў асобных выпадках хвасьцізм ячэек і няцьвёрдасьць у адстайваньні рэкамэндуемых кандыдатур, а таксама асобныя выпадкі парушэньня партыйнае дысцыпліны і нават блёкаваньне з кулацка-заможніцкімі элемэнтамі паасобных партыйцаў і камсамольцаў, якія разлажыліся і акулачыліся. Разам з гэтым у шэрагу месцаў наглядаліся выпадкі нядбайных адносін мясцовых арганізацый да належнай падрыхтоўкі кандыдатур; недастаткова на мясцох выкананы дырэктывы аб увязцы перавыбарчай кампаніі са справаю агляду груп беднаты, які з гэтае прычыны даў недастаткова станоўчыя вынікі.

Конкурс на лепшую сэкцыю гарадзкога савету, лепшы сельскі і местачковы савет з яго камісіямі, які павінен быў быць шчыльна ўвязаны са справаздачна-перавыбарчай кампаніяй, на справе не знайшоў глыбокага адбітку ў гэтай кампаніі і разгарнуўся са значным спазьненьнем ужо пасьля справаздач саветаў, чым у значнай ступені была страчана яго вартасьць і зьменшаны магчымасьці сапраўднага і ўсебаковага выяўленьня праз конкурс дасягненьняў і хібаў у працы саветаў.

Перавыбары выявілі недастатковую сувязь значнай часткі саветаў і іх дэпутатаў з масай выбаршчыкаў, што знайшло свой адбітак у шэрагу рэзалюцый і выступленьняў па справаздачах саветаў. Недастатковае яшчэ ўцягненьне да справаздач перад выбаршчыкамі радавых членаў саветаў. У шэрагу райёнаў наглядалася няпоўнае выкарыстаньне рэвізійнымі камісіямі іх правоў у галіне праверкі выкананьня наказаў і дырэктыў вышэйшых органаў і недастатковая справаздачнасьць рэвкамісій перад выбаршчыкамі. Разам з гэтым трэба адзначыць недастатковы ўдзел у справаздачна-перавыбарчай кампаніі КСУ і каапэрацыйных арганізацый.

Справаздачнасьць саветаў перад выбаршчыкамі была разгорнута шырока, але ў некаторых мясцох быў нездавальняючы зьмест яе.

Асабліва недастаткова саветамі ў іх справаздачах былі вызначаны мерапрыёмствы і дасягненьні ў пытаньнях гаспадарчага перабудаваньня вёскі на сацыялістычных падставах: каапэраваньне, калектывізацыя, падняцьце ўраджайнасьці і г. д

Вось галоўныя моманты станоўчага і адмоўнага ў выніку кампаніі па перавыбарах саветаў бягучага году.

Што трэба ў асноўным ужыць, каб замацаваць лепшыя вынікі перавыбараў і палепшыць працу новых саветаў?

Улічыць і зьнішчыць усе недахопы, якія наглядаліся ў гэту кампанію; з іх галоўныя: несыстэматычнасьць працы з вясковай беднатой і недастаткавая яе ўвязка з задачай узмацненьня бядняцка-серадняцкага блёку, слабасьць працы груп беднаты, недастатковасьць гаспадарчай і масавай працы саветаў, недастатковая сувязь дэпутатаў з масаю выбаршчыкаў праз сыстэматычную справаздачнасьць, неразгорнутасьць працы камісій сельскіх і местачковых саветаў.

Трэба ў самы бліжэйшы час распрацаваць шэраг канкрэтных мерапрыёмстваў па ажыўленьню масавай і практычнай працы саветаў у напрамку замацаваньня і яшчэ большага разьвіцьця ўзросшай палітычнай актыўнасьці рабочых і асноўнай масы сялянства, арганізуючы гэтыя масы на справе дзелавой работы саветаў, іх камісій і сэкцый, забясьпечваючы за масамі ўдзел у вырашэньні штодзённых практычных задач сацыялістычнага будаўніцтва. Трэба дабіцца ўсімі вызначанымі партыяй мерамі і сродкамі, каб саветы зрабіліся сапраўднымі арганізуючымі асяродкамі працоўных гораду і вёскі вакол выкананьня гаспадарча-культурных задач пяцігадовага пляну разьвіцьця народнае гаспадаркі і сацыяльна-культурнага будаўніцтва. У адносінах сельскіх саветаў трэба, каб задачы сацыялістычнага перабудаваньня вёскі, калектывізацыі сельскай гаспадаркі, пашырэньня пасеўнае плошчы, уздыму ўраджайнасьці **былі асновай гаспадарчай працы**, гуртуючы вакол гэтых вузлавых пытаньняў сацыялістычнага будаўніцтва ўсю масавую працу саветаў

Ня раз ужо пісалася і гаварылася, што бюджэты зьяўляюцца неабходнейшай матар'яльнай базай разгортваньня гаспадарча-культурнай дзейнасьці і масавай арганізацыйнай працы саветаў. Зроблена-ж вельмі мала. Тут патрэбен рашучы пералом. Неабходна зараз-жа сёлета перавесьці больш буйныя сельскія саветы на самастойныя бюджэты, ужыць канкрэтныя мерапрыёмствы да належнага афарміленьня самастойнасьці ўжо існуючых сельскіх і местачковых бюджэтаў і палепшаньня бюджэтаў гарадзкіх саветаў.

Мы маем у выніку перавыбараў павялічэньне процанту няпісьменных у складзе сельскіх саветаў з 1,9 да 4,5 проц. Гэта тлумачыцца тым, што ў склад саветаў увайшло больш батракоў, беднаты і жанчын, з якіх шмат няпісьменных. Наша задача на мясцох зараз жа безадкладна ўзяцца за ліквідацыю няпісьменнасьці сярод членаў сельсаветаў дзеля таго, каб яны праз паўгода змаглі быць хоць бы элемэнтарна пісьменнымі для актыўнай працы ў саветах. Разам з гэтым арганізацыйна замацаваць і палітычна выхаваць уцягнутыя ў выніку апошняй кампаніі сьвежыя кадры працоўных, асабліва рабочых, батракоў, жанчын і працоўных нацменшасьцяў, не пакідаючы ніводнага дэпутата савету без практычнай працы і без дапамогі ў яго працы з боку больш падрыхтаваных савецкіх працаўнікоў. Шырока скарыстаць арганізаваныя для гэтай мэты цэнтральныя і мясцовыя (акруговыя і райённыя) курсы па падрыхтоўцы і перападрых

МІЖНАРОДНЫ ДЗЕНЬ КААПЭРАЦЫІ.

У Міжнародны дзень каапэрацыі шлём прывітаньне рэвалюцыйным каапэратарам усяго сьвету.

БОЛЬШ УВАГІ КАЛГАСАМ І САВГАСАМ--АПОРЫ САЦЫЯЛІЗМУ Ў ВЁСЦЫ ПРАЗ КААПЭРАВАНЬНЕ І ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫЮ--ДА САЦЫЯЛІЗМУ.

Узмацнім і палепшым каапэрацыйнае абслугоўваньне Чырвонай арміі.

РАЗГОРНЕМ САМАКРЫТЫКУ І АКТЫЎНАСЬЦЬ МАС, ВЫЛУЧЫМ КІРАЎНІКОЎ У КААПЭРАЦЫЮ З РАБОЧЫХ, БАТРАЦКІХ І БЯДНЯЦКІХ ШЭРАГАЎ.

Дасягненьні с.-г. каапэрацыі БССР.

Сельска - гаспадарчая каапэрацыя БССР, выконваючы генэральную лінію камуністычнай партыі ў галіне ўзьняцьця і сацыялістычнай перабудовы сельскае гаспадаркі, практычна праводзіць гэтую працу галоўным чынам праз:

а) арганізацыю аграмаджаных форм калектыўных гаспадарак; б) вытворчае каапэраваньне сялянскіх гаспадарак; в) дастаўку сельскай гаспадарцы сродкаў вытворчасьці і арганізацыю загатовак і збыту таварнай прадукцыі сельскае гаспадаркі і г) праз правядзеньне мерапрыёмстваў па надвышэньні ўраджайнасьці сялянскіх гаспадарак, шляхам арганізацыі шэрагу агракаапэрацыйных мерапрыёмстваў і разьвіцьця кантрактацыі.

Які-ж вынікі ў працы мае с.-г. каапэрацыя БССР да Міжнароднага Дню Каапэрацыі?

За апошнія гады сельска-гаспадарчая каапэрацыя мела буйны тэмп росту сельска - гаспадарчых аб'яднаньняў і ахопу каапэраваньнем насельніцтва. Так, на 1-X—26 г. мы мелі 889 с.-г. каапэрацыйных аб'яднаньняў з 200000 пайшчыкамі, а на сёнешні дзень маем 4273 аб'яднаньняў і 468 тысяч пайшчыкаў.

Мы бачым, што ў параўнаньні з 1926 г., лік аб'яднаньняў павялічыўся амаль у 5 разоў, а колькасьць членаў ўзрасла больш як у 2,5 разы. Па 1-га красавіка 1929 г. сельска-гаспадарчай каапэрацыяй каапэравана 58,1 проц. усіх сялянскіх гаспадарак БССР. Шпаркі тэмп арганізацыі сельска-гаспадарчых аб'яднаньняў асабліва разгарнуўся ў апошні год, галоўным чынам па лініі арганізацыі калектыўных гаспадарак і іншых вытворчых відаў аб'яднаньняў. Так, за час з 1 кастрычніка 1928 г. па 15 мая 1929 г. арганізавана 434 калгасы на плошчы 53.348 гэктараў, замест прадугледжаных плянам па 1928 - 1929 год арганізацыі 360 калгасаў. Такім чынам, на 15 мая гадавы плян арганізацыі калгасаў выканан ужо больш як на 120 проц. З агульнага ліку каапэраваных у с.-г. каапэрацыю ўцягнута 122595 бядняцкіх сялянскіх гаспадарак, з якіх 41569 бядняцкіх гаспадарак каапэравана за лік фонду па каапэраваньні беднаты. Па ўсёй сыстэме сабрана звыш 2 міліёнаў руб. наявых узносаў самаго насельніцтва, з якіх толькі за мінулы год сабрана каля аднаго міліёну рублёў.

Разам з павялічэньнем самой сеткі с.-г. каапэрацыі, павялічваецца і расьце таксама і абём снабжэнчаска-збытавой працы сыстэмы. Так, калі ў 1927-28 г. сыстэмай было рэалізавана снабжэнчаскіх тавараў на суму 6536 тыс. руб., то ўжо ў 1927-28 г. рэалізавана на 10399 тыс. руб., а на пляну гэтага году (мяркуецца рэалізаваць ужо на 17604 тыс. руб. Па збытавым апэрацыям звароты за гэтыя гады складалі: у 1926-27 г. 7644 тыс. руб., у 1927-28 г.—12437 тыс. руб. і на пляну гэтага году на суму 18799 тыс. руб. У мэтах зьмяншэньня накладных выдаткаў на снабжэнчаска-збытавыя тавары з кожным годам павялічваюцца транзітныя перавозы тавараў непасрэдна ад прамысловасьці да нізавога зьвяна каапэрацыі і зараз з агульнага ліку завазімых снабжэнчаскіх тавараў да 90 проц. ідуць транзітам супроць 12 проц. транзітных перавозак у 1926-27 г. Накладныя выдаткі зьменшаны па ўсіх зьвеньнях сыстэмы: па нізавой сетцы па снабжэнчаскіх таварах—з 6,1 пр. звароту ў 1926-27 г. да 5,6 проц. у 1927-28 г.; па акрсельсаюзах—з 7,1 проц. да 6,0 проц. і Белсельсаюзу—з 3,7 проц. да 2,4 проц.

У агульным аб'ёме плянавых загатовак асноўных відаў с.-г. прадуктаў і сыравіны с.-г. каапэрацыя на рынку БССР праводзіць да 40 проц. агульнай колькасьці загатовак.

Побач з разгортваньнем працы па ахопу таварнасьці сялянскае гаспадаркі збытавой працай, пашырылася і правядзімая с.-г. каапэрацыяй кантрактацыя. Так, у 1926-27 г. сыстэмай была праведзена кантрактацыя розных культур на плошчы 14861 гэктар, у 1927-28 г.—на 60924 гэкт., а ў гэтым годзе ўжо толькі па адных вясеньніх культурах на плошчы 98800 гэктараў

За апошнія паўтара гады ўзмацнілася і фінансавае становішча сыстэмы. Да 1927-28 г. уся сыстэма ў сваёй працы мела толькі дэфіцыты, але ўжо ў мінулым апэрацыйным годзе па ўсёй сыстэме меўся прыбытак 674 тыс. руб.

Вядома, што разам з маючыміся дасягненьнямі сельска-гаспадарчая каапэрацыя БССР мае яшчэ і шмат слабых бакоў у сваёй працы. Недастаткова яшчэ разгорнута праца на індустрыялізацыі і машынізацыі сельскае гаспадаркі. Вытворчыя нізавыя аб'яднаньні працуюць яшчэ слаба і недастаткова прыстасаваны да задач вытворчага каапэраваньня і калектывізацыі сялянскай гаспадаркі і ў гэтым напрамку патрэбна яшчэ шмат чаго зрабіць, але пад кіраўніцтвам партыі і актыўным удзеле ў працы с.-г. каапэрацыі беднаты і серадняцтва вёскі, сельска-гаспадарчая каапэрацыя БССР ускладзеную на яе камуністычнай партыяй адказную задачу па будаўніцтву сацыялізму на вёсцы выканае.

Ісакаў.

ПАЛЕПШЫМ КААПЭРАЦЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

(Гутарка са старшынёю праўленьня жыльлёва-будаўнічай каапэрацыі тав. Левіным).

Жыльлёва-будаўнічая каапэрацыя існуе з 1925 году. Неабходнасьць заснаваньня яго выклікана ўзростам усей нашай гаспадаркі, павялічэньнем гарадзкога пралетарыяту, які бязупынна папаўняецца прыцёкам жыхароў з вёскі і пашырэньнем жыльлёвай плошчы для працоўных. У сувязі з гэтым у гарадох БССР адчуваецца значны кватэрны крызіс, зьліквідаваньне якога ўскладзена на жыльбудкаапэрацыю.

Праца жыльлёвай каапэрацыі, складаецца з двох асноўных відаў: жыльлёва-арандная і будаўнічая. У абедзьвюх галінах мы маем значныя дасягненьні.

У жылярэндная каапэрацыі БССР на сёнешні дзень ёсьць жактаў 81 з арэндамі плошчай 632.000 кв. мэтр., што складае павялічэньня на 164 процанты ў параўнаньні з 1926 годам.

Па сацыяльным групам плошча разьмешчана гэткім парадкам: рабочыя займаюць 40,2 проц., служачыя 41,3 проц., іншыя 18,5 проц.

З 1925 г. да гэтага году жыльбудкаапэрацыя зрабіла рамонту на 3.640.000 руб. У адным-жа сёлетнім годзе праэктуецца рамонт на 1200000 р.

Па жыльбудаўнічай каапэрацыі ёсьць сяброў 4.347 асоб, што дае павялічэньне ў параўнаньні з 1926 г. на 190 проц. За час існаваньня каапэрацыі 2.000 сямейств каапэрацыі атрымалі новыя кватэры, што складае 46 проц. агульнай колькасьці сяброў.

Паявы капітал у 1926 годзе складаў 118.000 руб., а ў 1929 складае 775 тысяч рублёў.

Пачынаючы ад 1926 г. жыльбудкаапэрацыя пабудавала 594 новых дамоў з 1924 кватэрамі (кватэра складаецца з кухні і 2-3 пакояў) плошчай у 104 кв. мэтр. на агульную суму 7.680.000 руб.

Апроч гэтага, пабудавана за ўвесь час 3 дзіцячыя сады, 4 пляцоўкі, 1 ясьлі, 2 прачкарні і 3 калектыўныя кухні.

Разам з дасягненьнямі ў працы каапэрацыі ёсьць цяжкасьці і шэраг недахопаў.

Па жактах сустракаюцца наступныя цяжкасьці: недастатковае крэдытаваньне Белкамунбанкам (крэдытам здаволена жылярэндная каапэрацыя ўсяго на 50 проц.), няма доўгатэрміновага крэдыту, без чаго наша арганізацыя ня можа разгарнуць шырокай працы па пабудове і рамонту.

Па жыльбудкаапэрацыі. Непармальнае паступленьне рэспубліканскіх фондаў крэдытаваньня, недахоп будаўнічых матар'ялаў. Нашы цэгляныя заводы ня здолеюць выконваць заказы на цэглу, ня вытрымліваюць заключаных умоў на своечасовую дастаўку матар'ялаў і г. д. Коратка кажучы, вытворчасьць матар'ялаў, патрэбных пры пабудове, адстае ад агульнага тэмпу ўзросту нашага будаўніцтва, што вельмі цяжка адбіваецца на самым будаўніцтва.

Адчуваецца недахоп сярэдняй і вышэйшай кваліфікацыі тэхнічнага персаналу.

Бясплянавасьць і стыхійнасьць заяў на пабудову і рамонт дамоў пазбаўляе магчымасьці жыльбудкаапэрацыю належным парадкам падрыхтавацца да працы і запасьціся матар'ялам.

У далейшым, выконваючы пастановы і наказы партыі і ўлады ў справе рэканструкцыі нашае гаспадаркі, якія чырвонаю ніткаю праходзяць праз усю працу каапэрацыі, мы павінны дасягнуць наступнага:

аабіцца доўгатэрміновага крэдыту ад нашых грашовых прадпрыёмстваў;

зьнізіць сабекошт і ўкласьціся ў лімітныя цэны будаўніцтва 1929 г.;

павялічыць процант плошчы, якая займаецца рабочымі, з 40,2 проц. да 50

У сувязі з узбуйненьнем жактаў, палепшыць абслугоўваньне жактамі сяброў каапэрацыі, уцягваючы іх у справу пашырэньня працы і мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў (капіталу) каапэрацыі.

М.

Зьнішчым растраты і злачынствы.

(Гутарка са старшынёй праўленьня БСКІ тав. Адзінцом).

БСКІ мае сваю гісторыю: ён заснаваны ў 1921 г., з мэтаю сацыяльна забясьпечыць вялікую масу інвалідаў грамадз. і імпэрыялістычнай вайны.

За гэты час саюз значна ўзрос. У 1923 г. налічвалася 200 каапэраваных інвалідаў, у 1924г., 424, а на 1-X—1928 г. узрос да 1289 асоб па ўсёй БССР, што ў процантах павялічылася на 312.

БСКІ на сёняшні дзень мае 80 гангандлёвых і вытворчых прадпрыёмстваў столькі-ж налічвалася на 1-X—1925 г. Стабілізацыя агульнай колькасьці аб'яднаньняў тлумачыцца тым, што за памянёны перыяд быў узяты курс не на павялічэньне колькасьці прадпрыёмстваў, а на іх узбуйненьне.

Выраб прадуктаў па сабекошту ў 1926-27 г. складаў 2.432.000 р., а ў 1927-28 г.—3.918.000 руб.

Прадукцыйнасьць працы кожнага рабочага ў год павялічвалася ў гэткай прапорцыі: у 1926-27 г.—3.400 р., у 1927-28 г.—4.900 р.

Павялічыўся таксама валавы зварот саюзу: у 1927-28 г. па 25,5 проц. у параўнаньні з 26-27 г.

У агульнай суме звароту павялічана ўдзельная вага звароту за кошт уласных вырабаў з 46 проц. у 1926-27 г. да 67 проц. у 1927-28 г., адначасова паменшана ўдзельная вага па перапродажу тавараў з 53 проц. да 32 пр. Гэткія лічбы характарызуюць разьвіцьцё вытворчасьці саюзу ў азначаны тэрмін, тэмп якога не памяншаецца і на сёнешні дзень.

Паявы капітал на 1-X—1928 г. павялічыўся да 94.000 руб. супроць 47.000 руб. на 1-X—1926 г. (200 проц.); у сярэднім пай на аднаго чалавека павялічыўся з 59 р. 20 кап. да 72 р. 90 кап. (на 27 проц.).

Павялічэньне вырабу і правядзеньне цэлага шэрагу мерапрыемстваў па рацыяналізацыі гаспадарчай дзейнасьці—значна паменшылі сабекошт усіх відаў вытворчасьці. Напрыклад, кошт аднаго гарнітура ў 1926-27 г. быў 31 р. 65 к., а ў 1927-28 г.—26 р. 7 кап., такім чынам зьніжэньне яго складае 18 проц. У гэткай самай меры зьніжаны і па іншых галінах вытворчасьці.

Са ўзростам гаспадарчай дзейнасьці саюзу, палепшылася і матар'яльнае становішча каапэраваных інвалідаў. Месячны заробак на 1 чалавека ў сярэднім павялічыўся з 50 р. у 1925 г. да 63 р. у 1927-28 г.

Палепшана і павялічана дапамога з боку касы ўзаемадапамогі, якая не абмяжоўваецца матар'яльнай дапамогай у часы хваробы, радоў, сьмерці і г.д., але пасылае сяброў у дамы адпачынкр, на курортныя і санітарныя лячэньні. Пасылка на курорты і ў дамы адпачынку павінна сёлета ахапіць 25 проц. усіх інвалідаў.

Адным з характэрных момантаў, якія выяўлены пры абсьледваньні і рэвізіях, зьяўляецца наліччa злачынстваў паасобных кіраўнікоў аддзяленьняў БСКІ напрыклад, растраты, недахопы, безгаспадарчасьць, сувязь з прыватным рынкам і г. д., гэтыя злачынствы па сваёй колькасьці, у параўнаньні з мінулым годам, ня зьменшыліся. Гэта тлумачыцца тымі абставінамі, што летась абсьледваньнямі і рэвізіямі ня былі поўнасьцю ахоплены ўсе аддзяленьні і прычыны недахопаў інструктароў.

За ўсе злачынствы вінаватыя прыцягнуты да судовай адказнасьці з адначасовым зьняцьцем з пасады.

У сёлетнім годзе догляд з боку рэвізыйных камісій і інструктарскага апарату значна ўзмоцнен, што дае гарантыю зьмяншэньня ліку злачынстваў.

У сувязі з пастановамі XVI партканфэрэнцыі зараз саюз праводзіць падрыхтоўку і чыстку апарату ад нягодных і шкодных элемэнтаў.

Пяцігадовы плян разьвіцьця нашае гаспадаркі ставіць перад БСКІ наступныя задачы:

Давесьці колькасьць прадпрыёмстваў да 217, з якіх 159 будуць вытворчымі, 32 сельска-гаспадарчымі і 26 гандлёвымі.

Давесьці колькасьць каапэраваных інвалідаў да 4392 асоб, з якіх 3802 рабочых будуць працаваць на вытворчых прадпрыёмствах, 360—у сельска-гаспадарчых і 230— у гандлёвых.

Гадавая прадукцыя ў канцы пяцігодкі павінна складаць 16127600 р., а валавы зварот—19820500 руб. За 5 год павінна быць зьніжана каштоўнасьць да канца пяцігодкі па галоўных групах вытворчасьці, прадугледжаны ў гэткім разьмеры:

Адпускныя цэны па скурн.-шавецкай вытворчасьці—на 21,6 проц., па кравецка.-шапачн. вытворчасьці— на 25,6 проц., па каўбаснай вытворчасьці —на 17,1 проц.

Вось у асноўным нашы дасягненьні і задачы ў далейшым.

С.



КУХНЯ Ў СТАЛОЎЦЫ МАГІЛЕЎСКАГА ЦРК.



ХЛЕБАЗАВОД У ГОМЕЛІ.

„Прыкладная" дапамога.

Машаўскае спажывецкае таварыства перажывае цяжкі фінансавы крызіс. Былое праўленьне таварыства так „пладаніта" працавала, што за мінулы 1927-28 г. таварыства мае дэфіцыт у 2.000 руб. і растрат на 1.500 р. Каб троха скарапіць выдаткі, новае праўленьне адчыніла ў Клімавіцкай касе Дзяржбанку бягучы рахунак. У Клімавічах-жа ёсьць сельска - гаспадарчае крэдытнае таварыства «Камуніст», якое часам прымае да вучоту вэксалі. Калі прышоў тэрмін выкупу вэксалёў Машаўскага спажывецкага таварыства, якія былі ўлічаны ў „Камунісьце", дык „Камуніст", недаючы аб бягучых рахунках, не знайшоў патрэбным запытаць касу Дзяржбанку аб наяўнасьці грошай на бягучым рахунку Машаўскага сельска-гаспадарчага таварыства і не атрымаўшы грошай непасрэдна ад т-ва, згроб вэксалі, ды ў пратэст. У выніку спажывецкае таварыства, хаця вэксалі выкупіла за кошт бягучага рахунку, але мела непатрэбныя выдаткі.

Вось як дапамагло крэдытнае таварыства.

Селькор.

Працавалі нядрэнна.

Перавыбары Ціхінічаскага сельска-гаспадарчага таварыства прайшлі пры актыўным удзеле ўсіх упаўнаважаных. На сходзе прысутнічала 95 проц. упаўнаважаных. Падрыхтоўка да перавыбараў у гэтым годзе была значна лепшая, чымся ў мінулым. У мінулых перавыбарах упаўнаважаных абіралі толькі ў буйных вёсках, а ў гэтыя былі ахоплены нават маленькія селішчы.

З дакладу праўленьня выяўлена, што праца значна ўзьнялася. Аб гэтым сьведчыць таваразварот, забясьпечаньне неабходнымі прыладамі сельскай гаспадаркі і пашырэньне працы таварыства.

У галіне калектывізацыі і кантрактацыі плян выкананы на 110 проц. і належна абслужана бадната ў час веснавой слуўбы.

Як недахопы трэба адзначаць наступнае: недастатковa зьвернута ўвага на каапэраваньне беднаты далёкіх вёсак, як Заліцьвіньне В.-Крушынаўка, не аказана дапамога машынным таварыствам і інш. Падкрэсьліўшы ўсе недахопы, сход даў наказ, па якому новаабранае праўленьне будзе выпраўляць хібы. У сябры абраны адназгодна раней працаваўшыя таварышы.

Я. Крушына.

Вечар прысьвечаны міжнароднаму дню каапэрацыі.

Сёньня ў памяшканьні БДТ адбудзецца ўрачыстае пасяджэньне каапэрацыйнага актыву, прысьвечанага міжнароднаму дню каапэрацыі. Пасьля ўрачыстай часткі адбудзецца канцэрт.

Арганізуем групы беднаты у саматужна-прамысл. каапэрацыі

Арганізацыя сыстэмы саматужна-прамысловай каапэрацыі, па трапнаму выразу аднаго з партпрацаўнікоў, перажывае Кастрычнікавую рэвалюцыю. Мінулая перавыбарчая кампанія прайшла гэтак жа, як і мінулыя гады. Маса саматужнікаў рыхтавалася крытыкаваць выключна вышэйшыя органы за недахоп тавараў і крэдыту.

Была дадзена дырэктыва аб чыстцы арцеляў і аб падборы клясава-блізкага кіруючага складу ўкрэдытна-прамысловых таварыствах і арцелях. У Бярэзінскім раёне, дзе большасьць саматужнікаў каапэравана ў арцелі шаўцоў і краўцоў, калі пытаньне стаяла аб выключэньні са складу арцелі Левіна Н., Чартка Х. і Бушловіча маса саматужнікаў ніяк не магла зразумець, што бяз гэтых гаспадароў, былых эксплёататараў, якія ўвесь час кіравалі работай арцеляў, знойдуцца ня менш кваліфікаваныя кіраўнікі з ліку беднаты і той моладзі, якая раней эксплёатавалася гэтымі „дзельцамі".

Былі скліканы групы беднаты 2-х кравецкіх і 2-х шавецкіх арцеляў для папярэдняга абмеркаваньня пытаньня аб зьліквідаваньні гэтых арцеляў. Адразу было пастаўлена пытаньне, што беднае трэба выйсьці з гэтых арцеляў і арганізавацца ў самастойныя арцелі, бо ўжыцца з больш багатымі яны ня змогуць; пасьля растлумачэньня партячэйкі і прапановы ўмоўна пакінуць больш заможных, як больш кваліфікаваных, але з тым, каб яны далей ня мелі права ўдзельнічаць у вырашэньні пытаньняў, датычных усяго жыцьця арцелі, было пастаноўлено аб'яднаць шавецкія арцелі ў адну, а таксама 2 кравецкія ў адну.

У Пагосцкай шавецкай арцелі арганізатарам вьяўляецца былы гаспадар Кац; ён у якасьці заснавальнікаў і членаў арцелі прыняў 3 сваіх былых рабочых і аднаго карабейніка, уклаў у арцель 250 руб. на набыцьцё тавараў, за што атрымлівае па 25 р. проц. за свае грошы, г. зн. 125 проц. на свой капітал. Сам Кац у арцелі непрацаваў, а займаўся тольки адшуканьнем для яе заказаў; апроч таго, у арцель ён прыняў кладаўшчыком свайго сына, які здолеў ужо зрабіць растрату ў 150 руб. і прыпісаць свайму бацьку некалькі дзесяткаў руб.

У крэдытна-прамысловым т-ве, дзе летась меў моцны ўплыў [бярэзінскі рабін, жонка якога зьяўляецца пайшчыцай крэдытна-прамысловага т-ва, установа на дапамогу саматужніку наогул — бядняк ён ці заможны. Калі камісія „лёгкай кавалерыі" ЛКСМ абсьледвала прынцып выдачы ссуд, дык выявіла, што беднота мае 35 проц. пая, з ссуды атрымлівае ўсяго толькі па 19 проц., у той час, як заможныя маюць 17 проц. паю а атрымліваюць ссуды на 40% і больш процантаў. Бачыце багатаму „патрэбны грошы на вялікія звароты, ён-жа прызвычаен лепш зарабляць і лепш жыць, а бядняк ніколі ня еў белай булкі і зараз ня трэба да гэтага прывучаць",—такая прыблізна думка больш заможнай часткі кіруючай вярхушкі якая, нажаль, і кіравала палітыкай выдачы ссуд, а потым, бачыце, „бедняку наогул небясьпечна пазычаць, бо ён можа і неаддаць, а ўзяць з яго ня будзе чаго". Адначасова прапусьцілі тэрмін звароту пазык як раз заможныя.

Перавыбарчая кампанія і выключэньне ў сувязі з гэтым некаторых былых гаспадароў пазбавіць іх уплыву на справы арцелі; падбор адпаведнага кіруючага складу зьяўляецца парукай, што сыстэма саматужна-прамысловай каапэрацыі будзе ісьці ў сваей працы правільным каапэрацыйным савецкім шляхам.

Беднота вышла на шлях актыўнасьці, і трэба, каб мясцовая арганізацыя і беларускі саматужна-прамысловы саюз замацавалі на справе гэту актыўнасьць.

Рэзкін.

СТАНОВІШЧА РАБОЧАЙ КААПЭРАЦЫІ БССР.

РОСТ ЗВАРОТАЎ.

Рабочая каапэрацыя БССР за апошнія гады дасягнула значных посьпехаў у справе ахопу рынку, даходзячага ў 1928-29 г. да 60 проц. Сярэдні месячны зварот яе на 1-га чэрвеня 1928 г. складаў 5 мільёнаў р., а на 1-ае чэрвеня г. г. 7 міл. рублёў што дае рост на 40 проц. Узрост звароту, галоўным чынам, ідзе за кошт павялічэньня с.-г. групы тавараў, якая ў асартымэнце рабочай каапэрацыі займае ўсё большае і большае месца. У 1927-28 г. с.-г. група тавараў разам з хлебапрадуктамі займала 31 пр. з ў першым паўгодзьдзі 1928-29 г.—34 проц.

Асабліва шпаркі ўзрост тавараў дае група мясных і малочных прадуктаў. Так, увесь зварот па мясу і мясных прадуктах за 1-е паўгодзьдзе 1927-28 г. складаў 1.607 тысяч руб., а за першае паўгодзьдзе 1928-29 г.—4111 тысяч руб., ці ўзрост на 255 проц., па малочных прадухтах з 1129 тысяч руб.—да 1614 тысяч руб., па гародніне і садавіне з 410 тысяч руб.—да 1541 т. р.

ЯКАСЬЦЬ АБСЛУГОЎВАНЬНЯ ПАЛЯПШАЕЦЦА.

Рост звароту рабочай каапэрацыі павялічваўся адначасова з разгортваньнем гандлёвай сеткі. На 1-га чэрвеня 1928 г. было 497 крам, на 1-га чэрвеня г. г. налічваецца ўжо 772 адзінкі (узрост на 54 проц.).

Аднак, ня гледзячы на значныя дасягненьні рабочай каапэрацыі ў справе агульнага росту, якаснае абслугоўваньне спажыўца застаўся пакуль што нізкім. Толькі ў апошні час пачалі ўжывацца мерапрыёмствы па паляпшэньню якаснага абслугоўваньня, пашырэньню гандлёвай сеткі, паляпшэньню асартымэнтаў тавараў і г. д.

Пры недастатковасьці гандлёвай сеткі і адсутнасьці сродкаў будаўніцтва новай, перад рабочай каапэрацыяй стаіць задача максімальнага выкарыстаньня існуючай сеткі. Гэта, магчыма, можна будзе дабіцца пры ўстанаўленьні бесперапыннага гандлёвага тыдню.

Апошняе мерапрыёмства павялічыць прапускальную здольнасьць сеткі і паменшыць чаргі. Апроч таго, неабходна ўзмацніць працу па грамадзка-каапэрацыйнаму выхаваньню гандлёвага апарату, бо бяз гэтага нельга дабіцца нармальных узаемаадносін паміж прадаўцом і спажыўцом.

ПАШЫРЭНЬНЕ МЭХАНІЗАВАНАГА ХЛЕБАПЯЧЭНЬНЯ.

Рабочая каапэрацыя БССР мае вялікія дасягненьні ў галіне хлебапячэньня. За мінулы год ва ўласных хлебапякарнях ЦРК было выпечана 27000 тон хлеба, што ахапляе рынак толькі на 34 проц. За першае паўгодзьдзе 1928-29 г. ужо выпечана 21300 тон ці 53 проц. запатрабаваньняў насельніцтва. А ў паасобных гарадох каапэрацыйнае хлебапячэньне поўнасьцю задавальняе запатрабаваньні працоўнага насельніцтва. Пабудова хлебазаводаў у Менску, Магілеве, Воршы і мэханізацыя пякарняў у інш. гарадох спрыяла шпаркаму разьвіцьцю каапэрацыйнага хлебапячэньня. Закончаны і прыступіў да выпечкі хлеба хлебазавод у Гомелі, шпаркім тэмпам ідзе пабудова хлебазаводу ў Віцебску. У бліжэйшы час распачынаецца пабудова хлебазаводу ў Бабруйску.

УЗМАЦНІМ ДАПАМОГУ РАБОЧАЙ КААПЭРАЦЫІ.

Вага ўласных капіталаў у балянсе звароце нашай рабочай каапэрацыі вельмі нязначная, таму пытаньне мабілізацыі ўласных сродкаў павінна зрабіцца цэнтрам увагі рабочай каапэрацыі.

Сёлетні год дае зрух у галіне збору паявога капіталу. На 1-га чэрвеня 1928 г. паявы капітал рабочай каапэрацыі складаў 1.106 тысяч руб. на 1-га чэрвеня г. г.—1.927 тысяч руб.

Але ня гледзячы на гэты ўзрост мы ўсё-ж такі адстаём у гэтых адносінах ад сярэдніх даных па рабочай каапэрацыі Саюзу. Фінансавае становішча рабочай каапэрацыі настойліва патрабуе ўзмацненьня збору ўласных сродкаў, і ў гэтым напрамку трэба выкарыстаць усе магчымасьці.

РОСТ ПАЙШЧЫКАЎ І АКТЫЎНАСЬЦЬ МАС.

Разам са значным узростам гаспадарчай дзейнасьці наша рабочая каапэрацыя мае вялікія дасягненьні ў галіне каапэраваньня насельніцтва, узмацненьня грамадзка-масавай працы ЦРК і працы каапэрацыйнага актыву. На 1-га чэрвеня 1928 г. налічвалася 142.100 пайшчыкаў, на 1-га чэрвеня г. г.—201.000 пайшчыкаў, ці ўзрост на 41 проц.

Грамадзка-масавая праца ў асноўным выяўляецца ў правядзеньні сходаў пайшчыкаў па абгаварэньню справаздач аб дзейнасьці ЦРК і высьвятленьня перажываемых цяжкасьцяй у галіне забесьпячэньня прадуктамі. За апошні год павялічылася актыўнасьць мас пайшчыкаў. Можна заўважыць дзелавое і сьвядомае абгаварэньне працы ЦРК, высоўваньне цэлага шэрагу практычных прапаноў па паляпшэньню працы свайго ЦРК.

Палепшылася праца каапэрацыйнага актыву, які налічвае ў сваіх шэрагах звыш 1500 упаўнаважаных і 2000 членаў крамных камісій. Большая частка каапэрацыйнага актыву прымае ўдзел у працы ЦРК, шляхам удзелу на пасяджэньнях сэкцый упаўнаважаных, шляхам абсьледваньня паасобных прадпрыёмстваў, праверкі цэн і калькуляцыі тавараў, дзяжурства ў крамах, удзел у розных камісіях, бюро скаргаў і г. д.

Праца каапэрацыйнага актыву і ўзмацненьне актыўнасьці яго ў значнай ступені садзейнічае пасьпяховаму разьвіцьцю і ўзросту рабочай каапэрацыі.

Сацыялістычнае спаборніцтва, якое разгарнулася паміж ЦРК і паасобнымі каапэрацыйнымі прадпрыёмствамі, яшчэ больш узмацніць рабочую каапэрацыю.

М.

ПАМЯТАЙЦЕ, ШТО 26—28 ЛІПЕНЯ ГЭТАГА ГОДУ Ў ГОРАДЗЕ ХАРКАВЕ АДБУДЗЕЦЦА

ТРЭЦІ ТЫРАЖ ВЫЙГРЫШАЎ 2-ое ПАЗЫКІ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ УРАДУ БССР.

Пастанова

Савету Народных Камісараў БССР

пра прыцягненьне груп вясковай беднаты да працы, зьвязанай з крэдытаваньнем сялянства.

Для больш правільнага разьмяркоўваньня сум сельска-гаспадарчага крэдыту між паасобнымі сацыяльнымі групамі пазычальнікаў, правільнага скарыстоўваньня пазычак на прызначэньне і своечасовага звароту іх, а таксама для большага ўплыву сельска-гаспадарчага крэдыту на ўзмацненьне сацыялістычнага сэктару і дапамогі вытворчаму каапэраваньню сельскай гаспадаркі, Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Абавязаць сельска-гаспадарчыя крэдытныя таварыствы прыцягваць да актыўнага ўдзелу ў працы таварыстваў групы беднаты.

2. Кіраўніцтвы сельска-гаспадарчых крэдытных таварыстваў, раней чымся абмяркоўваць на пасяджэньнях кіраўніцтва, савету, на агульных сходах пайшчыкаў або ўпаўнаважаных таварыства, павінны абавязкова падаваць на абмеркаваньне груп беднаты наступныя пытаньні:

а) гадовы плян крэдытаваньня сельскай гаспадаркі з вызначэньнем сум на крэдытаваньне калектыўных гаспадарак, іншых каапэрацыйных аб'яднаньняў і паасобных бядняцкіх гаспадарак;

б) пра скарыстаньне фонду ільготнага крэдытаваньня беднаты, фонду крэдытаваньня калектыўных гаспадарак і (фонду каапэраваньня беднаты;

в) пра абмеркаваньне разьмеру процантаў за пазычкі і разьмеру пазычак на асобныя катэгорыі мерапрыемстваў;

г) пляны пасеўных кампаній і канкрэтных мерапрыемстваў для іх правядзеньня;

д) пра мерапрыемствы для павялічэньня ўкладаў сялянства ў сельска-гаспадарчыя крэдытныя таварыствы;

е) пра праверку скарыстаньня і звароту пазычкі таварыству;

ж) справаздачы аб дзейнасьці таварыства;

з) усе пытаньні, зьвязаныя з перавыбарамі кіраўнічых і рэвізійных органаў сельска-гаспадарчых крэдытных таварыстваў;

і) пра дапамогу сельска-гаспадарчым крэдытам вытворчаму каапэраваньню.

3. На ўсе пасяджэньні кіраўніцтва, савету і рэвізійнае камісіі сельска-гаспадарчых крэдытных таварыстваў павінен запрашацца з правам дарадчага голасу прадстаўнік груп беднаты.

4. Абавязаць кіраўніцтвы сельска-гаспадарчых крэдытных таварыстваў у сваіх справаздачах адзначаць, колькі і якіх прапаноў груп беднаты ажыцьцёўлена, а таксама колькі і з якіх прычын адхілена.

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР **М. Карклін.**

Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнай Нарады БССР **М. Калевіч.**

1 ліпеня 1929 г.
г. Менск.

Пастанова

Савету Народных Камісараў БССР

аб захадах для забясьпечаньня разьвіцьця каапэрацыі інвалідаў.

Заслухаўшы даклад Народнага Камісарыяту Сацыяльнага Забясьпечаньня і саддаклад Дзяржпляну аб становішчы і разьвіцьці каапэрацыі інвалідаў за 1927-1928 год і пра кантрольныя лічбы вытворчага пляну гэтай каапэрацыі на 1928-29 г., Савет Народных Камісараў адзначае, што побач з дасягненьнямі, якія ёсьць у каапэрацыі па лініі некаторага пашырэньня вытворчага каапэраваньня інвалідаў, павялічэньня асноўных фондаў і выпрацоўкі прадукцыі на аднаго рабочага, павялічэньня заработнае платы, зьніжэньня сабекошту, зьніжэньня адміністрацыйных выдаткаў, якое рабілася праз зьменшаньне абслугоўваючага пэрсаналу, а таксама па лініі павялічэньня каапэраваньня, галоўным чынам інвалідаў вайны і працы і павялічэньня паенакапленьня, ёсьць наступныя недахопы:

а) недастаткова і з перапынкамі забясьпечваліся дэфіцытным сырцом вытворчыя арцелі інвалідаў;

б) адстае павялічэньне вытворчасьці працы ад росту заработнае платы;

в) няма адпаведных сродкаў па перападрыхтоўку інвалідаў працы з мэтай уцягненьня іх у вытворчыя арцелі;

г) недастаткова яшчэ ахоплены каапэраваньнем інваліды, асабліва інваліды вёскі;

д) яшчэ вялікая адносная вага неінвалідаў у агульным складзе занятых у арцелях;

е) недастаткова мэханізіравана вытворчасьць арцеляў і невыстарчальна крэдытаваньне на гэту мэту;

ж) недастатковая нагрузка гандлёвых прадпрыемстваў, арцеляў, у выніку чаго ёсьць высокія накладныя выдаткі;

з) недастаткова выконваецца акруговымі і раённымі выканаўчымі камітэтамі пастанова СНК БССР за 13 мая 1925 году „Аб дапамозе некаторым катэгорыям асоб, якія знаходзяцца на дзяржаўным забясьпечаньні да ўваходу ў вытворча-працоўныя інвалідныя аб'яднаньні" (С. З. БССР за 1925 г., № 27, арт. 239);

і) слаба разгортваецца культурна-асьветная работа сярод каапэраваных інвалідаў.

Каб зьнішчыць усе паказаныя недахопы і для аказаньня ўсебаковай дапамогі разьвіцьцю каапэрацыйных аб'яднаньняў інвалідаў паводле пастановы III сэсіі Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту VIII скліканьня, Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Зьвярнуць увагу адпаведных ведамстваў і органаў БССР на настойлівую патрэбу няўхільнага выкананьня мерапрыемстваў, вызначаных III сэсіяй Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР VIII скліканьня за 23-га верасьня 1928 г. па дакладу Народнага Камісарыяту Сацыяльнага Забясьпечаньня, у частцы каапэрацыі інвалідаў.

2. Запрапанаваць Вышэйшаму Савету Народнай Гаспадаркі, акруговым і раённым выканаўчым камітэтам пры перадачы прамысловых прадпрыемстваў і прамысловага інвэнтару каапэрацыйным арганізацыям прыраўняць да апошніх і вытворча-каапэрацыйныя арганізацыі інвалідаў.

3. Для найбольшай мэханізацыі вытворчасьці арцеляў запрапанаваць Народнаму Камісарыяту Фінансаў улічваць пры выдзяленьні сродкаў на фінансаваньне каапэрацыйных сыстэм патрэбу большага задаваленьня крэдытамі каапэрацыі інвалідаў.

4. Запрапанаваць Народнаму Камісарыяту Гандлю і Вышэйшаму Савету Народнай Гаспад. зьвярнуць належную ўвагу на патрэбу забясьпечаньня каапэрацыі інвалідаў дэфіцытным сырцом.

5. Абавязаць сыстэму сельска-гаспадарчага крэдыту крэдытаваць сельска-гаспадарчыя арцелі інвалідаў грашыма, інвэнтаром, насеньнем, угнаеньнем і сродкамі вытворчасьці, прычым складаючы свае штогоднія пляны даваць крэдыты сельска-гаспадарчым вытворчым прадпрыемствам арцеляў інвалідаў на тых-жа ўмовах, якія даюцца сельска-гаспадарчай каапэрацыі.

6. Запрапанаваць Народнаму Камісарыяту Земляробства даць адпаведныя загады ўсім падпарадкаваным яму органам аб дачы сельска-гаспадарчым арцелям інвалідаў зямельных вучасткаў, садоў, сельска-гаспадарчых прадпрыемстваў і г. д. нараўне з сельска-гаспадарчай каапэрацыяй і аб аказаньні дапамогі ў справе арганізацыі сельска-гаспадарчых арцеляў інвалідаў.

7. Абавязаць акруговыя раённыя выканаўчыя камітэты і гарадзкія саветы ўстанавіць для каапэрацыйных арцеляў інвалідаў арэндную плату за месцы для гандлю на вуліцах, плошчах і базарах (у кіосках, палатках, ларках і ў разноску) у гарадох і рабочых пасёлках такую, якая існуе для іншых відаў каапэрацыі.

8. Абавязаць акруговыя і раённыя выканаўчыя камітэты, гарадзкія і местачковыя саветы аддаваць каапэрацыі інвалідаў у першую чаргу нараўне з іншымі відамі каапэрацыі ў арэнду ларкі, кіоскі, палаткі і месцы для стаянак і пабудовы кіоскаў, а таксама патрэбныя памяшканьні пад вытворчыя прадпрыемствы арцеляў інвалідаў.

9. Запрапанаваць Народнаму Камісарыяту Аховы Здароўя падаць у СНК свае заўвагі адносна фінансавых асыгнаваньняў па бюджэту, патрэбных для правядзеньня мерапрыемстваў для абслугоўваньня членаў каапэрацыйных арцеляў інвалідаў усімі відамі мэдыцынскае і санітарнае дапамогі, у тым ліку і пратэзыраваньнем агульным і зубатэхнічным.

10. Запрапанаваць Белжылсаюзу, Народнаму Камісарыяту Унаутраных Спраў, Народнаму Камісарыяту Асьветы і Белкаапсаюзу прыраўняць інвалідаў, якія зьяўляюцца членамі інвалідных каапэрацыйных аб'яднаньняў арцеляў, у дачыненьні кватэрнай платы, платы за дзяцей у дзіцячых ясьлях, садох і пляцоўках, а таксама ў дачыненьні да ўдзелу іх, як пайшчыкаў у Цэнтральным Рабочым Каапэратыве да членаў прафэсыянальных саюзаў.

11. Прыняць да ведама плян на 1928-29 г., распрацаваны Беларускім Саюзам Каапэрацыі інвалідаў і адначасова лічыць патрэбным:

а) узмацніць мерапрыемствы для стварэньня спэцыяльнага фонду доўгатэрміновага крэдытаваньня і для павялічэньня ўзваротных сродкаў каапэрацыі праз мабілізацыю ўнутраных сродкаў сваёй сыстэмы, павялічэньне паявых капіталаў ня менш, як на 60 проц., разьвіцьцё ўкладных апэрацыяў з боку членаў арцеляў, скарачэньне адміністрацыйна-кіраўнічых выдаткаў і забарону разьмеркаваньня чыстых прыбыткаў і капіталаў сярод членаў арцеляў інвалідаў;

б) даручыць Эканамічнай Нарадзе разгледзіць пытаньне аб пералічэньні ў асноўныя капіталы каапэрацыі інвалідаў 50 проц. доўгатэрміновай пазыкі, якая была атрымана ёю па дзяржаўнаму бюджэту да 1-га кастрычніка 1928.

в) запрапанаваць акруговым выканаўчым камітэтам павялічыць водпуск сродкаў па мясцовых бюджэтах на фінансаваньне каапэрацыйных арцеляў інвалідаў;

г) для ўзмацненьня вытворчай дзейнасьці арцеляў, запрапанаваць Беларускаму Саюзу Каапэрацыі інвалідаў павялічыць у 1928-29 годзе капітальныя ўкладаньні на 45 проц., галоўным чынам, для мэханізацыі вытворчасьці і падняцьця вытворчасьці працы ня менш чымся на 15 проц.;

д) павялічыць каапэраваньне інвалідаў на 30 проц., давёўшы адносную вагу інвалідаў працы да 40 проц., а агульную колькасьць інвалідаў, занятых у вытворчасьці, да 90 проц., адначасова ўжыўшы захады да скарачэньня неінвалідзнага складу арцеляў;

е) забясьпечыць павялічэньне каапэраваньня за лік інвалідаў вёскі праз разьвіцьцё працоўных і вытворчых арцеляў, якія працуюць на базе сельска-гаспадарчага сырцу БССР. Павесьці працу для арганізацыі з інвалідаў калектыўных гаспадарак і сельска-гаспадарчых арцеляў, асабліва садова-гароднага тыпу;

ж) працягваць курс на скарачэньне колькасьці гандлёвых арцеляў праз злучэньне іх у больш вялікія і на канцэнтрацыю гандлёвай дзейнасьці вытворчых арцеляў;

з) для падрыхтоўкі кадраў для вытворчай дзейнасьці арцеляў за лік інвалідаў, не дапушчаць у будучым зьніжэньня процанту вучаніцтва;

і) зьвярнуць асаблівую ўвагу на разгортваньне культурна-асьветнай працы сярод інвалідаў.

12. Лічыць мэтазгодным арганізацыю на вёсцы інвалідаў-карабейнікаў, для чаго запрапанаваць НК Сацыяльнага Забясьпечаньня, Белкаапсаюзу і НК Гандлю дагаварыцца аб скарыстаньні інвалідаў-карабейнікаў для рэалізацыі прамтавараў па спажывецкай сыстэме.

13. Запрапанаваць Беларускаму Саюзу Каапэрацыі Інвалідаў за лік 10 проц. адлічэньняў у фонд палепшаньня быту інвалідаў вылучыць ня менш 50 проц. з гэтага фонду на палепшаньне жыльлёвых умоў інвалідаў членаў арцеляў.

14. Даручыць НК Сацыяльнага Забясьпечаньня і НК Працы арганізаваць унутры сыстэмы каапэрацыі інвалідаў касы дапамогі для забясьпечаньня інвалідаў у выпадках часовага выхаду на хваробе з вытворчасьці. Сродкі для гэтай мэты ўносяцца арцелямі ў разьмеры, устаноўленым Народным Камісарыятам Сацыяльнага Забясьпечаньня і Беларускім Аб'яднаньнем Каапэрацыі Інвалідаў.

15. Паказаць акруговым і раённым выканаўчым камітэтам на патрэбу поўнага ажыцьцяўленьня пастановы СНК за 13-га мая 1925 г. і праз 2 месяцы заслухаць спэцыяльны даклад НК Сацыяльнага Забясьпечаньня на СНК аб выкананьні гэтае пастановы.

16. Запрапанаваць Народнаму Камісарыяту Працы і Галоўсацстраху вылучыць спэцыяльныя сродкі на перападрыхтоўку і кваліфікацыю інвалідаў працы для палягчэньня магчымасьці ўступленьня іх у вытворчыя арцелі каапэрацыі інвалідаў.

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР **М. Карклін.**

Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнай Нарады БССР **М. Калевіч.**

12 чэрвеня 1929 г.
г. Менск.

КАНФЭРЭНЦЫЯ СЯЛЯН ДАСЬЛЕДЧЫКАЎ.

Роля сялян-дасьледчыкаў у справе ўзьняцьця ўраджайнасьці.

З вялікім дакладам аб прынцыпах арганізацыі дасьледчай справы на Беларусі выступіў дырэктар Н.-Д. Інстытуту сельскай і лясной гаспадаркі імя Леніна т. **Гарэцкі.**

—Дасьледчая справа ў БССР,—кажа дакладчык,—разгортваецца ў такім напрамку, каб вывучаць і абслужыць усе галіны сельскай гаспадаркі. Асобнае месца ў гэтай галіне павінна заняць дасьледчая справа па буйным жывёлаводзтву і сьвінаводзтву. Мы ўжо маем 2 станцыі для дасьледаваньня жывёлы і станцыю буйнай рагатай жывёлы і сьвінаводную.

З палявых культур ва ўмовах БССР вялікую ролю адыгрывае лён і бульба. Дзеля гэтага ў нас арганізаваны станцыі па дасьледаваньню бульбы і лёну.

Усім вядома, што 3-хпалёўка зьяўляецца вялікай перашкодаю ў разьвіцьці сельскай гаспадаркі. Гэта архаічная сыстэма ўжо ў працягу 300 год трымае ў капцюрох сельскую гаспадарку Беларусі. Менская расьліна-водная станцыя занялася вывучэньнем новае формы севазвароту—без папару, пры ўвядзеньні пажніўных пасеўных культур, што значна павялічвае прыбытковасьць сельскае гаспадаркі.

Ва ўмовах Савецкай Беларусі асушэньне балот мае вялікае значэньне. Дзеля гэтага ў нас існуе Цэнтральная Балотная Станцыя ў Менску. Апроч таго, папырваюцца філіялы станцыі на Палесьсі, у Полаччыне і на іншаным сьляпянскім балоце.

Для дасьледаваньня лясной гаспадаркі ў нас ёсьць лясная дасьледчая станцыя; разгортваюцца досьледы па аграхіміі, па вывучэньню глеб БССР дзеля ўстанаўленьня, якое ўгнаеньне патрэбна ўнесьці ў тую ці іншую глебу.

У БССР арганізуецца цэлы шэраг дасьледчых станцый для вывучэньня розных галін сельскай гаспадаркі. Навукова-Дасьледчы Інстытут робіць устаноўку, каб праца дасьледчых станцый праводзілася ў сьціслай сувязі з інстытутам сялян дасьледчыкаў, бо бяз гэтага нельга будзе распаўсюдзіць вынікі дасьледчых станцый сярод шырокіх колаў сялянства, бо бяз гэтага нам ня ўдасца ўзьняць ураджайнасьць нашых палеткаў. Зараз у БССР налічваецца каля 1600 гаспадарак сялян-дасьледчыкаў, але гэтага, бязумоўна, мала; трэба ўцягваць у шэрагі дасьледчыкаў новыя кадры сялянства, усе савгасы, калгасы, школы.

Тав. Гарэцкі заклікае сялян-дасьледчыкаў шырока дзяліцца сваімі вопытамі з сялянскімі масамі.

— Годнасьць селяніна-дасьледчыка,—зазначыў дакладчык,— зьяўляецца вельмі ганаровай. Той дасьледчык, які трымае свае веды ў сакрэце, не зьяўляецца савецкім дасьледчыкам, і такому дасьледчыку не павінна быць месца ў нашых шэрагах.

ХРОНІКА.

У Народным Камісарыяце Асьветы.

Яўрэйская хімічная школа.

Калегія Народнага Камісарыяту Асьветы пастанавіла адчыніць сёлета ў Менску яўрэйскую хімічную школу.

Кіно-фільм аб піанэрскім зьлёце.

Даручана Белдзяржкіно зазьняць усебеларускі зьлёт піанэраў—для дэманстраваньня і папулярызацыі яго сярод працоўных і ўдзельнікаў зьлёту.

Бюджэт НКАсьветы—17.593.969 р.

Зацьверджан бюджэт Народнага Камісарыяту Асьветы на 1929-30 год у суме 17593969 руб.

ПАДРЫХТОЎКА ДА ПІАНЭРСКІХ ЗЬЛЁТАЎ.

Калегія Наркамасьветы вызначыла цэлы шэраг мерапрыёмстваў па падрыхтоўцы да ўсебеларускага піанэрскага зьлёту. Навукова-мэтадалёгічнаму камітэту запрапанавана распрацаваць праграму зьлёту, разьлічваючы на павялічэньне праграмы гульняў і скараціўшы даклады. Наркомасьветы будзе выступаць з спэцыяльнай справаздачай.

Галоўмастацтву запрапанавана да 20-га ліпеня апрацаваць плян мастацкага абслугоўваньня зьлёту, і Белдзяржкіно даручана зазьняць усю работу зьлёту.

Прэзыдыум ЦСПСБ з свайго боку таксама пастанавіў даць указаньні мясцовым органам прафсаюзаў адносна дапамогі камсамолу ў правядзеньні райённых зьлётаў і пасылкі дэлегацый на ўсебеларускі зьлёт.

Пры правядзеньні ўсебеларускага зьлёту прафарганізацыям г. Менску запрапанавана ўсямерна дапамагаць у справе арганізацыі вочнароў змычкі дэлегатаў з менскімі рабочымі і піанэрамі, размешчэньню дэлегатаў па кватэрах менскіх рабочых, якія маюць піанэраў.

Для правядзеньня зьлёту прэзыдыум ЦСПСБ пастанавіў асыгнаваць 300 руб., адпучыўшы ЦК саюзаў у сваю чаргу таксама вылучыць поўныя сродкі на гэту справу; перад упаўнаважаным НКМЗ пры СНК БССР ставіцца пытаньне аб дазволе дармовага праезду на чыгунцы ўдзельнікам зьлёту.

Нарада па калгасным будаўніцтве.

У працягу трох дзён адбывалася пашыраная нарада пры савеце Белкалгасаюзу з удзелам прадстаўнікоў округ, каапэрацыйных арганізацый і прадстаўнікоў некаторых рэспубліканскіх устаноў.

Нарада абмеркавала даклад старшыні Белкалгасаюзу тав. Сьмірнова аб сэсіі Усесаюзнага савету калгасаў і чарговыя задачы калгаснага будаўніцтва ў БССР.

Апроч таго, нарада абмеркавала вынікі вясеньняй пасеўнай кампаніі і плян падрыхтоўкі да асеньняй сэўбы, пытаньні маёвай і культурнай працы ў калгасах, а таксама вырашыла цэлы шэраг арганізацыйных пытаньняў па калгаснаму будаўніцтву.

Масавыя экскурсіі працоўных.

На гэтых днёх з Полацку з заводу „Праца" выехала масавая экскурсія ў Ленінград. Экскурсанты-рабочыя азнаёмяцца са шкляной прамысловасьцю ленінградзкіх заводаў.

Вучні гарадзкіх школ, у ліку 60 чал., наладжваюць экскурсіі ў Віцебск, пасьля чаго наведаюць Асінбуд, дзе азнаёмяцца з яго будаўніцтвам.

27 чэрвеня фізкультурнікі, у ліку 40 асоб, выехалі на экскурсію па напрамку Віцебск—Гомаль—Менск, дзе азнаёмяцца з фізкультурнай і інш. працай.

4 ліпеня камсамольцы выяжджаюць на экскурсію ў горад Леніна, дзе пагляджаць музэі, тэатры, заводы, фабрыкі і інш.

Будаўніцтва на Мар'інскім масыве.

Ма Мар'інскім масыве разгарнулася шырокае будаўніцтва. Да гэтага часу там арганізаваны ўжо 2 калгасы—чырвонаармейскі і яўрэйскі. Да восені маюць быць арганізаваны яшчэ 2 калгасы.

Больш увагі загатоўкам масла.

На прэзыдыуме ЦСПСБ былі заслуханы даклады адпаведных арганізацый аб забясьпечаньні рабочай каапэрацыі маслам. Па пляну прадбачылася загатовіць за май-чэрвень 120 тон масла, фактычна-ж загатоўлена толькі каля 40 тон. Прычым было адзначана, што якасьць масла нездавальняючая.

Прэзыдыум ЦСПСБ пастанавіў узбудзіць хадайніцтва перад Эканомнарадай і Наркамгандлем, каб яны ўжылі захады да ўзмацненьня тэмпу загатовак масла, зьвярнуўшы ўвагу на палепшаньне якасьці яго.

Калі пачнецца паляваньне на птушак.

Згодна рэспараджэньня Народнага Камісарыяту Земляробства БССР, паляваньне на цецярукоў, качак і іншую балотную птушку дазваляецца ў гэтым годзе з 23-га ліпеня.

Сьвята латышоў.

У гор. Полацку адбыўся гарадзкі сход латышоў, на якім прысутнічала некалькі дзесяткаў асоб. На сходзе стаяла пытаньне аб 25-гадовым юбілеі латыскай камуністычнай партыі бальшавікоў.

Выступала шэраг таварышоў з прамовамі, якія адзначылі, што камуністычная партыя праводзіць інтэрнацыянальную палітыку па-ленінску. У Савецкім Саюзе латышы адчуваюць сябе на раўне з усімі нацыянальнасьцямі.

БЛІЖЭЙШЫЯ ТЫРАЖЫ ВЫЙГРЫШАЎ ПА ПАЗЫКАХ.

У ліпені месяцы адбудуцца наступныя тыражы выйгрышаў:

1—5 ліпеня—14-ы тыраж 1-й выйгрышнай пазыкі 1922 г., будзе разыграна 13169 выйгрышаў на суму 800000 рублёў.

20-га ліпеня—10-ы тыраж 10 процантнай выйгрышнай пазыкі 1927 г., будзе разыграна 4001 выйгрыш на суму 700000 рублёў.

26-га ліпеня—3-ці тыраж выйгрышаў 2-й пазыкі індустрыялізацыі па абодвых выпусках (процантным і беспроцантным) будуць разыграны 103600 выйгрышаў на суму 11677200 рублёў.

У жніўні м-цы адбудзецца 8-ы тыраж выйгрышаў 1-й пазыкі індустрыялізацыі У тыражы будзе разыграна 23300 выйгрышаў на суму 3.001.500 руб.

Тыраж мяркуецца правесьці ў БССР у гор. Віцебску.

У верасьні адбудуцца тыражы: 1-га верасьня—12-ы тыраж выйгрышнай пазыкі 1926 г.; 15-га верасьня—5-ы тыраж выйгрышаў 3-й сялянскай пазыкі 1927 г.; будзе разыграна 75161 выйгрыш на суму 875000 рублёў; 16-га верасьня—2-гі тыраж выйгрышаў пазыкі 1929 г.; 20-га верасьня адбудзецца 4-ы тыраж выйгрышаў 2-й пазыкі індустрыялізацыі.

У Белсельбанку.

97.000 руб.—на перасяленьне.

Вызначана і ўжо адпушчана 97.000 р. на справу перасяленьня сялян у сёлетнім годзе.

Фінансаваньне мясазагатовак.

Для правядзеньня мясазагатовак Белсельбанк адпусьціў 140 тыс. руб. Апрача гэтага, адпушчана 240 тыс. руб. на адкорм жывёлы для мясазагатовак.

Мінэральнае ўгнаеньне для савгасаў.

Белсельбанк адпусьціў 30 тыс. руб. на закупку і загатоўку мінэральнага ўгнаеньня для савецкіх гаспадарак.

240 тыс. руб. на набыцьцё ўгнаеньняў.

Белсельбанк адпусьціў 240 тыс. руб. на загатоўку ўгнаеньня да асеньняй пасеўнай кампаніі. Разьмеркаваньне ўгнаеньня будзе ўвязана з пашырэньнем кантрактацыі азіміны.

Працаўнікі мастацтва—за беспераруўны рабочы тыдзень

Адбылася нарада ўсіх мясцкомаў і групкомаў саюзу прац. мастацтва г. Менску, на якой абгаварвалася пытаньне адносна бесперапыннага рабочага тыдню. Нарада прызнала неабходных у першую чаргу ўвесьці бесперапынны рабочы тыдзень у Белдзяржкіно.

Апавяшчэньне.

ДОМ АСЬВЕТЫ.

— Сёньня ў садзе вялікае гуляньне, прысьвечанае Міжнароднаму Дню Каапэрацыі. уваход па саюзных і клюбных кніжках. Пач. а 8 г. ув, (у выпад. дрэнная пагода пераносіцца ў дом) а 6 г. паседжаньне праўленьня. Заўтра кіно пач: а 10 г. ув.

БІБЛІАГРАФІЯ.

СЭРЫЯ „МАЛАДЫ ПРЫРОДАЗНАЎЦА".

Лісіца-Хітрыца. Пад рэдакцыяй Ів. Цьвікевіча. Беларускае дзяржаўнае выдавецтва. Менск, 1929 г., стар. 83, цана 30 кап.

Галоўнай заганай прыродазнаўча-прыгодніцкіх апавяданьняў, якія рэдагуе Ів. Цьвікевіч, зьяўляецца іх аднастайнасьць. Пасьля цікавага і бясспрэчна патрэбнага ўводнага артыкулу аб уласьцівасьцях і звычаях тых жывёлаў, аб чыіх прыгодах гаворыцца ў апавяданьнях, ідуць самыя гэтыя апавяданьні. Гэта заўсёды пераклады з чужых моваў, часам пераклады з „перакладаў. Пры гэткіх умовах было-б далёка больш мэтазгодна даць замест цэлага раду перакладаў—кампіляцыю з іх, а яшчэ лепш—самастойную апрацоўку з улічэньнем патрэб беларускага чытача, з апісаньнем нашае прыроды. Або, калі маюць на ўвазе пазнаёміць чытача з прыродай далёкіх краін, то трэба ўжо ў прадмове даць больш ведаў аб іх, бо ў самых апавяданьнях гэта робіцца звычайна выпадкова і няпоўна. Другою хібаю гэтай сэрыі зьяўляецца залішні антропаморфізм. Ужо раней зазначалася ў друку, што ў апавяданьнях прыродазнаўчага зьместу, зыдадзеных нашым Дз.Выд., сустракаюцца неверагодныя рэчы.

У разгледжаным цяпер апавяданьні—Ліс—Рэйнэке ведае, што хлапцы прыдуць яшчэ раз лавіць яго і ягоную сям'ю; ён робіць фальшывы выхад з нары (няглыбокую яму), ён не бяжыць ад людзей, а абходзіць навакол свайго жыльля, ідзе ў засаду і адтуль наглядае, сочыць за сваімі ворагамі. Лісіца Сільвэр-Грэй (срэбна-шэрая) сыстэматычна і сьвядома абясшкоджвае пасткі, кідаючы ў іх каменьне і ламаччо і г. д.

Магчыма (хоць і не саўсім пэўна), што ў аўтэнтыках дапушчана мясцамі і сьвядомая гіпэрбола з нейкімі нявыразнымі для нас мэтамі. На стар. 31 мы чытаем: „Але быў Лідзёля—і Рэйнэке мог-бы чакаць прыходу паляўнічых' яны заўсёды забіраліся ў гэтыя дні ў такія месцы, да якіх у звычайныя дні іншы-б не дабраліся. Але сюды, напэўна, ніхто ня прыдзе. Тут Рэйнэке можа быць зусім спакойным". Чытач лёгка можа прыняць гэта месца за разважаньні самога ліса.

Аб мове гэтых перакладаў былі ўжо нататкі ў друку. На нашую думку—няма сэнсу асабліва нападаць на гэтую сэрыю ў параўнаньні з іншымі перакладнымі творамі, асабліва прымаючы пад увагу тое, што часта бываюць і пераклады з перакладаў, г. зн. двойчы пасаваныя творы. Такія рэчы, як „геройскі" (ст. 7, замест: гэройска або гэраічна), амаль увесь (ст. 6—прапушчана: „ня" або „што"), „Сястра была ня менш (-меншая) за матку" (стар. 47), радаваўся жыцьцём (-жыцьцю стар. 31)—бясспрэчна псуюць нашую мову—але мы падобныя ляпсусы, на вялікі жаль сустрэнем і ў паважных і адказных выданьнях вучоных людзей.

Выдадзена кніжка добра, малюнкі цікавыя, цана—30 кап. за 83 старонкі—на надта ўжо дарагая. Але і ў гэтым і ў іншых сэнсах будзем чакаць удасканаленьня.

А. Смалянічч.

КІНО „КУЛЬТУРА".

„ХВОІ ГАМОНЯЦЬ".

Многа крывавых сьлядоў пакінула па сабе польская акупацыя... Многа новых магіл... Многа шампалоў і дубцоў зламалі акупанты на сьпінах беларускіх сялян...

Але многа было і памсьціўцаў за ўсе крыўды, раны... Галодныя, бяздомныя ў сваёй бацькаўшчыне яны хаваліся ў лясох, там бараніліся і адтуль баранілі крыў джаных панамі беларускіх сялян...

І ніколі на ўсё гэта не забудзецца беларускі народ... І аб гэтым гамоняць хвоі...

... Не сьцярпеў селянін дзікае расправы над аднавяскоўцамі, уцёк у лес. А да яго, атамана Асы, пачалі ісьці з торбамі, клункамі сяляне. Атрад Асы мог уступаць у бойкі з палякамі, за сьпіною якіх стаялі паны, з іх дапамогаю асядалі ў маёнтках. Вярнуўся граф, адабраў ад сялян хлеб, але ўступіўся Аса. Ён затрымаў ў дарозе графіню з дачкою. І граф мусіў дазволіць сялянам зьвесьці іх хлеб з поля. Толькі пан ашукаў.

А дачка (Г. Кудзелька), пабываўшы ў палоне ў партызан, пакахала прыгожага малайца Асу. Ён—у мярах яе, але ня просты, сялянскі, а шляхетны, у афіцэрскім убраньні... Раз папярэдзіла яго, што чакае небясьпека, другі раз стрэліла каб забіць...

На штыкох мацнела панская ўлада, цяжка было партызанам змагацца. Апошняя бойка і яе вынікі: многа трупаў сялян і спаленая вёска. Адступленьне на Бярозе да чырвоных—спатканьне з імі.

Фільм глядзіцца лёгка, не зважаючы на шэраг глыбока-драматычных момантаў, паданых без лішняе згушчанасьці фарбаў. Згушчаць фарбы тут можна было, бо праўда часта была горшай, як паказана ў фільму. Але праўда гэткая жудасная, што здавалася-б непраўдападобнаю... Гэта свайго роду парадокс... Рад момантаў фільму глядзіцца з вялікаю напружанасьцю, хвалюючы гледача.

Але ёсьць і нядалыя мясьціны, як занадта ўжо адкрытая сувязь між Асою і Алеськаю (Полла), аб якой ведалі палякі і—нічога. Між тым, палякі ў такіх разох зусім на лічыліся з дзяўчынаю-„хлопкаю". Таксама ня зусім удалае адступленьне партызан па Бярозе.

Не матываваны належным чынам псыхічны пералом у графіні-дачкі, калі яна ад захапленьня пераходзіць да спробы забіць Асу...

Але агульны тон узяты правільна, фільм накідае та сабе добрае ўражаньне.

З артыстаў трэба адзначыць выканаўца ролі Асы—Капралава.

Станоўчым бокам фільму зьяўляюцца і добрыя, у большасьці, здымкі; асабліва прыгожых краявідаў.

Габ.

З лістоў рабселькораў.

ТРЭБА СУПАКОІЦЬ.

24 чэрвеня гэтага году ў вёску Новыя Дарогі, Старадарожкага райёну, Бабруйскае округі на адной з васельняў прыехаў сябр. яўрэйскага калектыву Ліпман і начальнік пажарнай дружыны Астрэйка Мікола.

Пасьля вечарынкі, напіўшыся гарэлкі, Астрэйка узяўшы з сабой сьвісток, разам з Ліпманам паехалі на падводзе „катацца" па вуліцах Новых Дарог. Катаючыся, расьпявалі песьні і сьвісталі, быццам на трывогу.

Такіх нарушыцеляў спакою трэба супакоіць.

ВЯСКОР.

„НЯХАЙ ПАДПІШЧЫКІ ПРАБАЧАЮЦЬ".

(Стара-Дарожні р., Бабруйшчына).

Лістаносец Стара-Дарожкага паштовага аддзяленьня Н. Журко нядбайна адносіцца да сваёй справы: 2 чэрвеня, у нядзелю, замест таго, каб панесьці газэты ў вёску, ён пайшоў за 2 вярсты і прабыў там цэлы дзень, а газэты прынёс толькі ў сераду. Другі раз Журко заместа перадачы пошты цэлы дзень гуляў на вясельлі. Калі яму на гэта заўважылі, ён адказаў: „Няхай падпішчыкі прабачаюць. Я яшчэ пошты не разьбіраў". Трэці выпадак: 16 чэрвеня (зноў у нядзелю), таксама газэты ня прынёс. Акрамя гэтага, газэты прападаюць, лісты таксама прападаюць. Няхай лепш „прабачае" лістаносец і ўступіць месца другому працаўніку.

М. Галубок.

СЕЛЬСАВЕТ СЬПІЦЬ.

(Вёска Новы-Барэцк, Рэчыцкага р., Гомельшчына).

За сродкі самаабкладаньня Нова-Барэцкі сельсавет пабудаваў школу. Сёлета да самаабкладаньня сяляне хочуць пабудаваць пажарнае дэпо. Сродкі сабраны ўжо даўно, а пабудова яшчэ не пачалася. Калі сельсавет прачнецца і пачне працу?

Хутаць.

МУКА САПРЭЛА.

(Дзярноўскі с-с., Нараўлянскага р., Мазырскае акр.).

Дзярноўскае спажывецкае т-ва свой запас мукі зваліла ў пуню, дзе мука сапрэла. А 2 прыказчыкі нічога ня робяць для захаваньня мукі ад папсаваньня.

Пайшчык.

АГРАНОМ НЕ ПРАЦУЕ.

(Талочын, Аршанскае акр.)

Вучастковы аграном Цярэшчанка навінен абслугоўваць некалькі калгасаў і арцель, але ён нічога ня робіць. За доўгі час ён адзін толькі раз быў у арцелі. Аграном зусім не дапамагае сялянству.

К. Зав.

СПРАВАЧНЫ АДДЗЕЛ.

КАТЫРОЎКА ПАЗЫК НА 6-га ЛІПЕНЯ 1929 г.

	Пакуп.	Прад.
1-я 6 проц. залат. выйгр. паз.	4.79	—
2-я 6 проц. выйгр. паз.	5.00	—
Бяспроц. выйгр. пазыка 1926 г.	126.—	128 —
10 проц. дзярж. пазыка 1927 г.	26.13	26.23
6 проц. дзярж. выйгрыш. пазыка індустр.	25.54	25.64
3-я сялянск. выйгр. паз. 27г.	5.02,5	—
Дзярж. паз. Укр. сял. гасп.	10.51	10.55
12 проц. дзярж. унутр. 1927 г.	101.15	—
2-я 6 проц. паз. выйгр.	26.72	26.82
Пазыка індустр.	25.95	26